**РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ**

# ГАДАВІК

**ПАШЫРАНЫ**

**2017 | 2018 | 2019**

# ЗЬМЕСТ

Вітаньне ад Старшыні Рады БНР ................................2
Пра Раду БНР ...........................................................4
Старшыня .................................................................6
Прэзыдыюм ..............................................................7
Падзеі і мерапрыемствы ..........................................10
Мэдаль да Стагодзьдзя БНР ......................................17
Фотахроніка ............................................................19
Дакумэнты ..............................................................36
Артыкулы і выступы...............................................105
Summary in English ................................................115
Кантакт...................................................................116

# Вітаньне ад Старшыні Рады БНР



Дарагія суродзічы-беларусы!

У 2018 годзе сучасная беларуская дзяржаўнасьць адзначыла свой стогадовы юбілей. Нам пашанцавала быць сьведкамі гэтай вялікай даты. Дзейнасьць Рады БНР у 2017–2019 гг. шмат у чым была прысьвечаная менавіта юбілейным мерапрыемствам.

Ад 25 сакавіка 1918 году, і ні ад якой іншай даты, Беларусь бесперапынна існуе як фактар палітыкі ва ўсходнеэўрапейскім рэгіёне, як краіна і народ, чые інтарэсы ўсе вонкавыя сілы, як прыяцелі, так і ворагі, вымушаныя браць у разьлік.

Беларуская Народная Рэспубліка як вольная і дэмакратычная беларуская дзяржава, прагрэсіўная, адкрытая сьвету, дружная з усімі сваімі суседзямі, угрунтаваная на стагодзьдзях беларускіх дзяржаўніцкіх традыцый і на шанаваньні нашай самабытнай культуры, дагэтуль застаецца толькі ідэалам, які нашаму народу яшчэ трэба рэалізаваць.

Але часам менавіта захаваньне ў сваім сэрцы гэткага ідэалу і гэткай мэты – гэта тое, што грае вырашальную ролю і што вядзе да перамогі нават, здавалася б, у безнадзейнай сытуацыі.

Ідэалы і сымбалі Беларускай Народнай Рэспублікі вось ужо сто гадоў натхняюць беларусаў змагацца за сваю годнасьць і за лепшую долю: ад

герояў-случчакоў пачатку 1920-х да сябраў Беларускага Народнага Фронту ў часы “Перабудовы” і палітычных вязьняў і актывістаў у часы Лукашэнкі.

Вера ў гэтыя сьветлыя ідэалы – гэта тое, што адрозьнівае беларускі дэмакратычны рух ад ягоных непрыяцеляў. І гэта тое, што бясспрэчна прывядзе Беларусь да перамогі.

**Івонка Сурвіла**
**Старшыня Рады БНР**

# Пра Раду БНР

Рада Беларускае Народнае Рэспублікі – найстарэйшая дзеючая беларуская палітычная і дзяржаўная інстытуцыя, захавальнік традыцый беларускага нацыянальнага руху ад пачатку XX стагодзьдзя.

Рада была сфармаваная ў якасьці Рады Ўсебеларускага рьезду, які прайшоў у сьнежні 1917 г. ў Менску. Зьезд сабраў амаль 1900 дэлегатаў ад органаў мясцовага самакіраваньня, грамадзкіх і палітычных арганізацый усіх рэгіёнаў Беларусі.

У лютым і сакавіку 1918 г. Рада БНР у трох Устаўных граматах абвесьціла Беларусь сувэрэннай дэмакратычнай дзяржавай, у якой павінны гарантавацца і ахоўвацца ўсе асноўныя правы чалавека і дэмакратычныя свабоды. Тады Рада БНР выконвала функцыю часовага найвышэйшага калектыўнага органа дзяржаўнага кіраваньня на Беларусі. Яе задачаю была падрыхтоўка да правядзеньня Ўстаноўчага сойму, на якім мелі быць прынятыя базавыя законадаўчыя акты і распачаты працэс фармаваньня пастаянных органаў улады ў краіне. Савецкая акупацыя Беларусі не дазволіла гэтым плянам спраўдзіцца.

Ад 1919 г. Рада БНР дзейнічае ў выгнаньні. За гэты час Рада як прадстаўнік інтарэсаў Беларусі ў вольным сьвеце ўсталявала шчыльныя рабочыя кантакты з урадамі і дыпляматычнымі службамі многіх дзяржаваў, арганізавала шматлікія інфармацыйныя і адукацыйныя праекты, ад стыпэндыяў для беларускіх студэнтаў у заходнеэўрапейскіх унівэрсытэтах да выданьня беларускае літаратуры і пэрыёдыкі. Намаганьнямі Рады БНР было арганізаванае беларускамоўнае вяшчаньне гішпанскага радыё, а таксама створаная беларуская служба “Радыё Свабода”, якая па сёньняшні дзень застаецца адным з найважных беларускіх сродкаў масавае інфармацыі.

Адной з задачаў Рады было і застаецца інфармаваньне грамадзкасьці і палітычных колаў краінаў вольнага сьвету аб Беларусі і яе становішчы. Прадстаўнікі Рады БНР неаднаразова выступалі ў Парлямэнце Вялікай Брытаніі, мелі сустрэчы з вышэйшым кіраўніцтвам Злучаных Штатаў Амэрыкі, Канады, Чэскае Рэспублікі і іншых краінаў. Дзякуючы высілкам Рады БНР яшчэ ў 20-х гг. XX стагодзьдзя кіраўнцтва краінаў Захаду было праінфармаванае аб самастойных інтарэсах беларускага народу і пра яго дзяржаўніцкія памкненьні. Менавіта Рада БНР за шмат дзесяцігодзьдзяў

пасьлядоўнае працы падрыхтавала глебу для прызнаньня міжнароднай супольнасьцю незалежнасьці Рэспублікі Беларусь у 1991 годзе.

Пасьля распаду СССР і камуністычнага блёку аналягічныя экзыльныя дзяржаўныя структуры іншых краінаў нашага рэгіёну – польскі, украінскі і эстонскі ўрады у выгнаньні, латвійская дыпляматычная служба ў выгнаньні і іншыя – склалі свае паўнамоцтвы на карысьць дэмакратычна абраных уладаў сваіх краінаў. За кароткі час адносна дэмакратычнага разьвіцьця Беларусі Рада БНР не пасьпела гэтага зрабіць: сфармаваны ў 1990 годзе Вярхоўны Савет БССР XII скліканьня ня мог лічыцца дэмакратычна абраным парлямэнтам незалежнае Беларусі, а выбары ў Вярхоўны Савет XIII скліканьня ў 1995 годзе прайшлі зь істотнымі парушэньнямі ва ўмовах набіраючага моц аўтарытарнага рэжыму Аляксандра Лукашэнкі.

Сучасная місія Рады БНР палягае ў прадстаўніцтве інтарэсаў незалежнай і дэмакратычнай Беларусі ў сьвеце. Рада ўключае восемдзясят сябраў (радных), якія прадстаўляюць беларускія арганізацыі з 15 краінаў: Аўстраліі, Бэльгіі, Вялікай Брытаніі, ЗША, Канады, Латвіі, Літоўскай Рэспублікі, Нямеччыны, Польшчы, Расеі, Украіны, Францыі, Чэхіі, Швэцыі, Эстоніі. Кожныя два гады Рада БНР праводзіць Сэсіі, паміж якімі пастаянна дзеючым органам застаецца Прэзыдыюм Рады.

# Старшыня Рады БНР

З Статуту Рады БНР:

*§22. На чале Рады БНР стаіць Старшыня Рады БНР.*

*§23. Старшыня Рады БНР — найвышэйшы прадстаўнік Рады БНР і Беларускага Народу. Яго абірае Рада БНР на Сэсіі Рады БНР на тэрмін 6 гадоў. (...)*

*§25. Да кампэтэнцыі Старшыні Рады БНР належыць:*

*а) рэпрэзэнтаваньне БНР перад урадамі і нацыянальнымі прадстаўніцтвамі іншых народаў;*

*б) прызначэньне прадстаўнікоў БНР пры ўрадах і прадстаўніцтвах іншых народаў;*

*в) іншыя справы, што вынікаюць з займанага становішча, а не прызначаныя іншым органам.*

## Івонка Сурвіла, VII Старшыня Рады БНР

Нарадзілася ў 1936 годзе ў Стоўпцах. З 1944 году – у эміграцыі. Жыла ў Францыі, Даніі, Гішпаніі. Цяпер жыве ў Канадзе. Маці дзьвюх дачок.

Вучылася ў Вышэйшай Мастацкай Школе ў Парыжу. Скончыла лінгвістычнае аддзяленьне Сарбонскага Ўнівэрсытэту (1959). Акрамя роднае беларускае мовы валодае ангельскай, францускай, гішпанскай і дацкай мовамі, у мінулым таксама прафэсійна валодала нямецкай, лацінскай, нарвэскай, і польскай мовамі.

У 1959-1965 гадох працавала ў беларускай рэдакцыі Гішпанскага Нацыянальнага Радыё, выкладала францускую мову ў Францускім Інтытуце ў Мадрыдзе. З 1969 году і да апошняга часу працавала на розных пасадах у Бюро перакладаў пры Фэдэральным Урадзе Канады.

Займалася жывапісам, удзельнічала ў мастацкіх выставах.

У 1989 годзе арганізавала Канадзкі Фонд Дапамогі Ахвярам Чарнобыля ў Беларусі і заставалася яго кіраўніком да моманту абраньня Старшынёю Рады БНР.

# Прэзыдыюм Рады БНР

З Статуту Рады БНР:

*§20. Прэзыдыюм Рады БНР складаецца з Старшыні Рады БНР, ягоных Першага Заступніка і Заступнікаў, Сакратара, Скарбніка і сяброў. Абірае іх, устанаўляючы пры гэтым колькасьць заступнікаў і сяброў, Сэсія Рады БНР на тэрмін 6 гадоў. Склад Прэзыдыюму можа быць зьменены рашэньнем Сэсіі Рады БНР паводле патрэбы. (...)*

*§21. Да кампэтэнцыі Прэзыдыюму Рады БНР належыць:*

*а) вядзеньне справаў Рады БНР у часе паміж ейнымі Сэсіямі;*

*б) дапільноўваньне выкананьня пастановаў Сэсіі органамі Рады БНР;*

*в) рэпрэзэнтацыя Рады БНР навонкі;*

*г) скліканьне Сэсіяў Рады БНР.*

# Прэзыдыюм Рады БНР (працяг)

**Сяргей Навумчык**
Першы Заступнік Старшыні



У 1990-1995 гг. дэпутат Вярхоўнага Савету Беларусі XII скліканьня, каардынатар парлямэнцкай Апазыцыі БНФ.

Суаўтар Дэклярацыі аб Дзяржаўным Сувэрэнітэце Рэспублікі Беларусь.

Журналіст, аўтар шэрагу кнігаў па гісторыі станаўленьня незалежнай беларускай дзяржавы ў пачатку 1990-х.

---

**Вячаслаў Станкевіч**
Заступнік Старшыні



З 1990 па 1998 гг. дырэктар беларускай службы "Радыё Свабода", пазьней да 2013 г. выдавец квартальніка "Belarusian Review".

Старшыня Галоўнай управы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў 1969–1971 і 2007–2011 гг.

У 2009-2019 г. – Старшыня Беларускай фундацыі Крачэўскага.

---

**Мікалай Пачкаеў**
Заступнік Старшыні



Старшыня Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі з 2013 г., перад гэтым – намесьнік старшыні ЗБВБ з 2004 па 2013 гг.

Актывіст Беларускага Народнага Фронту з 1989 г. Сябра заснавальнага камітэту і ўдзельнік устаноўчага сойму Маладога Фронту.

У мінулым сябра Міжнароднай Камісіі БНФ, дэлегацыі БНФ на кансультацыях дзеля перамоваў з уладамі за пасярэдніцтвам АБСЭ, прадстаўнік Партыі БНФ у шэрагу краінаў.

# Прэзыдыюм Рады БНР (працяг)

**Паліна Прысмакова**
Сакратар

**Валер Дворнік**
Скарбнік

**Алесь Чайчыц**
Сакратар інфармацыі

**Ала Кузьміцкая**
Пратакольны сакратар

**Ала Орса-Романо**
Сакратар адукацыі

**Валянціна Трыгубовіч**
Архівіст

**Вячаслаў Бортнік**

**Алесь Кот**

**Сяргей Пяткевіч**

**Аляксандр Старыкевіч**

**Ганна Сурмач**

**Павал Шаўцоў**

# Падзеі і мерапрыемствы

## 2017

- 17 лютага ў Менску прайшла масавая акцыя пратэсту “Марш абураных беларусаў”. Пачалася сэрыя пратэстаў па ўсёй Беларусі, кульмінацыяй якіх сталася акцыя на 25 сакавіка ў Менску, падчас якой адбыліся масавыя затрыманьні і арышты.

- 13 чэрвеня беларус Міхаіл Жызьнеўскі, які загінуў у Кіеве падчас Рэвалюцыі годнасьці, стаў першым замежнікам, каму быў нададзены тытул Героя Ўкраіны.

- 15-16 ліпеня ў Менску прайшоў VII Зьезд беларусаў сьвету.

- Зь лютага Беларусь увяла бязьвізавы рэжым для грамадзянаў некалькіх дзясяткаў краінаў, у тым ліку краінаў Эўрапейскага Зьвязу, ЗША і Канады, пры ўмове ўезда праз аэрапорт “Менск-2” альбо пры ўезьдзе ў бязьвізавую зону на захадзе краіны, якая ўключае Берасьце і Гарадню.

- Цягам года абвастрылася супрацьстаяньне вакол Курапатаў, побач зь якімі пры абыякавым стаўленьні ўладаў і насуперак шырокаму грамадзкаму абурэньню пачала функцыянаваць рэстарацыя.

- У сьнежні споўнілася сто гадоў ад правядзеньня Ўсебеларускага зьезду 1917 г., на якім была ўтвораная Рада, што праз два месяцы стала Радай БНР.

- 20 студзеня Дональд Трамп уступіў у паўнамоцтвы Прэзыдэнта ЗША.

- 5 чэрвеня Чарнагорыя далучылася да NATO.

- У 2017 годзе ня стала Антона Шукелойця, раднага БНР, беларускага грамадзкага дзеяча ў ЗША.

# Мерапрыемствы Рады БНР

- У пачатку года пачала інтэрсіўную працу Камісія па ўзнагароджаньнях пры Радзе БНР у складзе некалькіх сябраў Прэзыдыюма Рады БНР. Першаю задачай Камісіі стала распрацоўка Статуту Мэдаля да Стагодзьдзя БНР, а таксама складаньне сьпіса кандыдатаў на ўзнагароджаньне Мэдалём, які потым быў пашыраны Старшынёй Рады БНР і Заступнікамі Старшыні Рады БНР. Выніковыя сьпісы ўзнагароджаных былі зацьверджаныя Дэкрэтамі Старшыні Рады БНР ад 24 сьнежня 2018 г., 31 траўня 2019 г. і 8 чэрвеня 2019 г.
    - Падрабязьней пра Мэдаль да Стагодзьдзя БНР гл. на с. 17.
- Арганізацыі, прадстаўленыя ў Радзе БНР, і радныя БНР узялі актыўны ўдзел у працы VII Зьезду беларусаў сьвету, які прайшоў у Менску ў ліпені 2017 г.
    - Старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла, а таксама радныя БНР Вячаслаў Бортнік, Янка Запруднік, Зінаіда Клыга, Мікалай Пачкаеў, Алег Рудакоў, Ганна Сурмач, Хведар Нюнька і Алесь Чайчыц, былі абраныя ў склад Вялікай Рады МГА “Згуртаваньне беларусаў сьвету “Бацькаўшчына”.
- У сьнежні 2017 г. Сакратарыятам інфармацыі Рады БНР створаны канал Рады БНР у Telegram.
- Цягам 2017–2019 гг. Сакратар Рады БНР Вячаслаў Бортнік прадстаўляў інтарэсы беларусаў Амэрыкі ў Цэнтральна- і Усходнеэўрапейскай кааліцыі (CEEC), ЗША.

# 2018

- Споўнілася 100 гадоў з абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі. Беларускія арганізацыі і суполкі па ўсім сьвеце правялі ўрачыстыя мерапрыемствы ў гонар юбілею незалежнасьці Беларусі. У Беларусі адбыўся вялікі сьвяточны канцэрт у цэнтры Менску, таксама адбыліся шматлікія імпрэзы ў розных рэгіёнах Беларусі. Афіцыйныя ўлады Беларусі збольшага праігнаравалі гэтую гістарычную дату.

- 17 лютага прах беларускай мэцэнаткі Магдалены Радзівіл быў перапахаваны ў Касьцёле Найсвяцейшай Тройцы ў Менску.

- 12 траўня ў Беларусі ўрачыста адкрыты першы помнік Тадэвушу Касьцюшку. Помнік паразьмешчаны на тэрыторыі сядзібы ва ўрочышчы Марачоўшчына ў Івацэвіцкім раёне.

- 15 сьнежня ў Сафійскім саборы Кіева прайшоў аб’яднаўчы сабор з удзелам Украінскай праваслаўнай царквы Кіеўскага патрыярхату і УАПЦ, на якім было абвешчана пра стварэньне новай Праваслаўнай царквы Ўкраіны.

- У 2018 годзе ня стала Барыса Кіта, беларускага грамадзкага дзеяча і навукоўца, а таксама Хведара Нюнькі, раднага БНР, дзеяча беларускае грамады ў Летуве.

# Мерапрыемствы Рады БНР

- Урачыстыя мерапрыемствы з удзелам Старшыні Рады БНР Івонкі Сурвіллы, арганізаваныя беларускай дыяспарай з нагоды стагодзьдзя Беларускай Народнай Рэспублікі, прайшлі ў парлямэнтах Канады і Вялікай Брытаніі, а таксама ў ратушы Прагі.
    - У мерапрыемстве ў брытанскім парлямэнце таксама ўдзельнічаў былы Старшыня Вярхоўнага Савету Беларусі Станіслаў Шушкевіч.
    - У Вашынгтоне Сакратаром Рады БНР Вячаславам Бортнікам было арганізаванае сьвяточнае прыняцьцё з удзелам былых амбасадараў ЗША ў Беларусі, супрацоўнікаў Дзяржаўнага дэпартаманту й недзяржаўных арганізацый. Былы кандыдат у Прэзыдэнты ЗША, вядомы амэрыканскі палітык сэнатар Джон Маккейн павіншаваў беларусаў з стагодзьдзем БНР у Twitter.
- Рада БНР уручыла Мэдаль да стагодзьдзя БНР больш, як 180 асобам у Беларусі і замежжы.
- Быў выдадзены альбом, прысьвечаны сьвяткаваньню стагодзьдзя БНР у сьвеце.
- 1-2 верасьня 2018 г. радныя БНР узялі ўдзел у XXXIII Сустрэчы беларусаў Паўночнай Амэрыкі ў Нью-Ёрку.
- У верасьні 2019 г. Сакратар Рады БНР Вячаслаў Бортнік наведаў Беларусь, Польшчу і Ўкраіну, каб сустрэцца зь беларускімі палітычнымі актывістамі й праваабаронцамі ў Менску, Гомелі, Варшаве, Львове й Кіеве, якім распавёў пра дзейнасьць Рады ды выслухаў прапановы магчымага супрацоўніцтва.

# 2019

- У 2019 годзе актывізаваліся непублічныя перамовы паміж аўтарытарнымі рэжымамі У. Пуціна ў Расеі і А. Лукашэнкі ў Беларусі аб далейшай інтэграцыі. Паралельна з гэтым расейскі бок узмацніў прапагандысцкі ціск на Беларусь. Лічыцца, што далучэньне Беларусі разглядалася пэўнымі групамі ўнутры Крамля як сродак для падтрыманьня рэйтынга прэзыдэнта У. Пуціна, а таксама як сродак працягнуць ягоныя фармальныя паўнамоцтвы, якія мелі скончыцца ў 2024 годзе. Перамовы суправаджаліся масавымі акцыямі пратэсту беларусаў супраць беларуска-расейскае інтэграцыі і скончыліся безвынікова, але расейскі інфармацыйны, палітычны і эканамічны ціск на Беларусь не спыніўся.

- Увосень у Беларусі прайшоў перапіс насельніцтва. Паводле папярэдніх вынікаў, насельніцтва Беларусі працягвала старэць і зьмяншацца. Занепакоенасьць грамадзкасьці выклікала магчымая фальсыфікацыя вынікаў перапісу з мэтай заніжэньня колькасьці карыстальнікаў беларускай мовы. На момант публікацыі гэтага Гадавіка канчатковыя вынікі перапісу яшчэ не былі вядомыя.

- Споўнілася 25 гадоў знаходжаньню А. Лукашэнкі на пасадзе прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, 80 гадоў з пачатку Другой сусьветнай вайны і анэксіі Заходняй Беларусі з боку СССР.

- У Латвіі, Літоўскай Рэспубліцы і Ўкраіне цягам году былі абраныя новыя прэзыдэнты.

- 22 лютага радная БНР і старшыня Беларуска-эстонскага згуртавання Іда-Вірумаа “БЭЗ” Зінаіда Клыга атрымала Ордэн Белай зоркі з рук прэзыдэнта Эстонскай Рэспублікі Керсты Кальюлайд.

- 22 лістапада ў Вільні адбылося ўрачыстае перапахаваньне герояў Паўстаньня 1863–1864 гг., у тым ліку Кастуся Каліноўскага і Зыгмунта Серакоўскага. Сьпіс паўстанцаў, пахаваных у капліцы на могілках Росы: Ян Бянькоўскі, Ціт Далеўскі, Мечыслаў Дарманоўскі, Ігнат Здановіч, Раймунд Зямацкі, Баляслаў Колышка, Альбэрт Лясковіч, Юльян Лясьнеўскі, Генрык Макавецкі, Ян Марчэўскі, Уладзіслаў Нікаляй, Аляксандар Раўкоўскі, Язэп (Юзаф) Раўкоўскі, Караль Сіповіч, Казімер Сычук, Эдвард Чаплінскі, Якуб Чэхан, Язэп (Юзаф) Яблонскі, а таксама Зыгмунт Серакоўскі і Канстанты Вінцэнт (Кастусь) Каліноўскі

# Мерапрыемствы Рады БНР

- 16 ліпеня, 31 ліпеня й 15 лістапада Сакратар Рады БНР Вячаслаў Бортнік сустракаўся з прадстаўнікамі Дзяржаўнага дэпартаманту ЗША. На сустрэчах абмяркоўвалася сытуцыя ў Беларусі.

- У верасьні Сакратар Рады БНР Вячаслаў Бортнік наведаў Курапаты ды ўсклаў бел-чырвона-белыя кветкі ад імя Рады БНР. 27-29 верасьня Сакратар Рады БНР узяў удзел у 8-м Міжнародным кангрэсе дасьледчыкаў Беларусі ў Вільні.

- Па афіцыйным запрашэньні літоўскага боку кіраўніцтва Рады Беларускае Народнае Рэспублікі ўзяло ўдзел у цырымоніі пахаваньня герояў Паўстаньня 1863–1864 гг.

    - Старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла, Першы заступнік Старшыні Рады БНР Сяргей Навумчык і Заступнік Старшыні Рады БНР Мікалай Пачкаеў прысутнічалі на ўрачыстым набажэнстве ў Віленскай катэдры разам з Прэзыдэнтам Польшчы Анджэем Дудам, Прэзыдэнтам Літоўскай Рэспублікі Гінтасам Наўседам і іншымі прадстаўнікамі дзяржаўнага кіраўніцтва Літоўскай Рэспублікі, Польшчы і Рэспублікі Беларусь.

    - Старшыня Рады БНР зьвярнулася да грамадзкасьці ў этэры тэлеканала “Белсат”.

- 23 лістапада ў Вільні прайшла юбілейная трыццатая Сэсія Рады БНР. Былі прадстаўленыя беларускія асяродкі ЗША, Бэльгіі, Вялікай Брытаніі, Канады, Латвіі, Літоўскай Рэспублікі, Польшчы, Расеі, Чэхіі і Эстоніі. У склад Прэзыдыюму Рады БНР і на пасаду Сакратара Рады была прынятая доктар Паліна Прысмакова з ЗША. Валеры Дворнік з ЗША прыняты на пасаду скарбніка. Былі ўручаныя некалькі Мэдалёў да стагодзьдзя БНР.

    - Перад Сэсіяй адбылася нарада падпісантаў Віленскага мэмарандуму 2012 г. з удзелам беларускіх грамадзкіх лідараў і кіраўнікоў галоўных палітычных партый і рухаў Беларусі. Нарада абмеркавала палітычную сытуацыю ў Беларусі і пагрозу незалежнасьці ў кантэксьце магчымага падпісаньня пагадненьняў аб паглыбленьні інтэграцыі між афіцыйным Менскам і Крамлём.

  - Кіраўніцтва Рады БНР таксама ўзяло ўдзел у набажэнстве, якое ў Базыльянскіх мурох правёў галава беларускіх грэка-каталікоў Сяргей Гаек.

- У ліпені 2019 г. Сакратарыятам інфармацыі Рады БНР створаны афіцыйны акаўнт Рады БНР у Instagram. Да канца году колькасьць падпісчыкаў перавысіла 600 чалавек. Старонка Рады БНР у Facebook у канцы года мела больш за 3 700 падпісчыкаў (што перавышае колькасьць падпісчыкаў старонак большасьці беларускіх палітычных партый і рухаў), падпісчыкаў конта Рады БНР у Twitter – 600 чалавек.

  - На старонках Рады БНР у сацыяльных сетках публікуюцца матар’ялы па гісторыі Беларускай Народнай Рэспублікі і дзейнасьці Рады БНР, біяграфіі выбітных дзеячоў беларускага нацыянальнага руху, заявы Рады БНР, архіўныя фота і дакумэнты з гісторыі беларускага руху.

- Сакратарыят інфармацыі Рады БНР працягвае актыўнае вядзеньне і разьвіцьцё афіцыйнага сайту Рады БНР. За апошнія гады сайт Рады БНР стаў заўважнай крыніцай архіўных дакумэнтаў па гісторыі Беларускай Народнай Рэспублікі і Рады БНР у выгнаньні, беларускага нацыянальна-вызвольнага руху, гісторыі першых гадоў станаўленьня сучаснай сувэрэннай Рэспублікі Беларусь.

  - Сайт зьмяшчае біяграфіі больш як ста дзеячоў БНР і беларускага нацыянальнага руху, дзьве сотні дакумэнтаў БНР і гістарычных дакумэнтаў, зьвязаных зь дзяржаўным будаўніцтвам і здабыцьцём Беларусьсю незалежнасьці.

# Мэдаль да Стагодзьдзя БНР



У 2018 годзе Рада БНР абвесьціла пра ўзнагароджаньне Мэдалём да стагодзьдзя Беларускае Народнае Рэспублікі.

Згодна са сваім статутам, Мэдаль уручаўся за пажыцьцёвыя заслугі ў працы дзеля зьдзяйсьненьня ідэалаў Акту 25 сакавіка 1918 г., у тым ліку за дасьледваньні і папулярызацыю беларушчыны, здабыцьцё і ўмацаваньне дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі, барацьбу за свабоду і дэмакратыю ў Беларусі.

Мэдалём узнагароджаныя:

– Асобы, якія адзначыліся на ніве змаганьня за волю і незалежнасьць Беларусі,

– Выбітныя грамадзкія і культурніцкія дзеячы ў Беларусі і сярод беларускага замежжа,

– Замежнікі, якія спрычыніліся да дасьледваньняў і папулярызацыі Беларусі ў сьвеце, а таксама іншым чынам спрыялі нацыянальным інтарэсам Беларусі.

Агулам узнагароджаныя больш за 180 асобаў зь Беларусі і замежжа.

Сярод узнагароджаных:

Вэтэраны беларускага незалежніцкага руху і палітычныя вязьні, у тым ліку Ірына Волкава, Надзея Дземідовіч, Міхась Кукабака, Эрнст Сабіла, Яўген Усюкевіч, Антон Фурс, Леакадзія Шышэя;

Дасьледчыкі беларускай гісторыі і культуры, у тым ліку Адам Мальдзіс, Аляксей Каўка, Захар Шыбека, Ірына Дубянецкая, Алесь Смалянчук і іншыя;

Літаратары, дзеячы культуры і папулярызатары Беларусі і беларушчыны, у тым ліку Сьвятлана Алексіевіч, Уладзімер Арлоў, Зьміцер Вайцюшкевіч і іншыя;

Грамадзкія дзеячы, у тым ліку Мая Кляшторная, Алесь Бяляцкі, Барыс Хамайда, Ада Райчонак і іншыя;

Палітыкі, якія спрычыніліся да аднаўленьня незалежнасьці Беларусі ў 1991 годзе, у тым ліку Станіслаў Шушкевіч, Зянон Пазьняк і дэпутаты Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце XII скліканьня, а таксама іншыя;

Актывісты беларускай дыяспары, у тым ліку Янка Запруднік, Вітаўт Кіпель, Ала Орса-Рамана і іншыя;

Замежныя дзеячы, што маюць заслугі перад Беларусьсю, у тым ліку міністар замежных справаў Чэхіі Карэл Шварцэнбэрг, кангрэсмэны ЗША Джон Шымкус і Крыстафэр Сьміт, дасьледчыкі Джым Дынглі, Джон Кунстадтэр, Дэвід Марплз, архітэктар беларускае царквы ў Лёндане Цзывай Со, амбасадары Джордж Крол, Стэфан Эрыксан, Дэвід Сўорц, а таксама іншыя.

# Фотахроніка



Заступнік Старшыні Рады БНР Мікалай Пачкаеў
на Зьезьдзе беларусаў сьвету, ліпень 2017 г. Фота Я. Іванюка



Сябра Прэзыдыюму Рады БНР Хведар Нюнька
на Зьезьдзе беларусаў сьвету, ліпень 2017 г. Фота ЗБС “Бацькаўшчына”



Саркатар інфармацыі Рады БНР Алесь Чайчыц
на Зьезьдзе беларусаў сьвету, ліпень 2017 г. Фота ЗБС “Бацькаўшчына”

Старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла на ўрачыстасьцях да стагодзьдзя
БНР у цэнтральным будынку парлямэнта Канады, Атава, сакавік 2018 г.



Стагодзьдзе БНР у парлямэнце Канады, сакавік 2018 г.




Заступнік Старшыні Рады БНР Мікалай Пачкаеў на імпрэзе ў гонар стагодзьдзя БНР у Брытанскім парлямэнце, Лёндан, сакавік 2018 г.




Сустрэча з Старшынёй Рады БНР Івонкай Сурвіллай, першым кіраўніком незалежнай Рэспублікі Беларусь Станіславам Шушкевічам і старшынёй Таварыства беларускае мовы імя Ф. Скарыны Аленай Анісім у Лёндане, сакавік 2018 г.

Беларусы Філядэльфіі, Нью-Джэрсі, Вірджыніі і Вашынгтону (ЗША) на сьвяточным мітынгу перад манумэнтам Свабоды ў Філядэльфіі, сакавік 2018 г.




Адкрыцьцё адноўленага помніку на нядаўна знойдзенай магіле
дыплямата БНР Міколы Вяршыніна, Прага, сакавік 2018 г.

Старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла на ўрачыстым мерапрыемстве
ў гонар стагодзьдзя БНР у праскай ратушы, сакавік 2018 г.

Імпрэза ў гонар стагодзьдзя БНР а праскай ратушы, сакавік 2018 г.




Альбом, прысьвечаны ўрачыстасьцям да стагодзьдзя БНР
у Беларусі і сьвеце



Надзея Дземідовіч, вэтэран беларускага руху, вязень Гулаг, узнагароджаная Мэдалём да стагодзьдзя БНР



Алена Макоўская і Ніна Шыдлоўская, кіраўнікі Згуртаваньня беларусаў сьвету “Бацькаўшчына”, узнагароджаныя Мэдалём да стагодзьдзя БНР




Агнешка Рамашэўска-Гузы, дырэктарка тэлеканала “Белсат”, Варшава



Сьвятлана Алексіевіч, пісьменьніца,
ляўрэят Нобэлеўскае прэміі па літаратуры



Зянон Пазьняк, лідар Беларускага Народнага Фронту і Апазыцыі БНФ
у Вярхоўным Савеце Беларусі XII скліканьня



Станіслаў Шушкевіч,
першы кіраўнік беларускай дзяржавы пасьля аднаўленьня незалежнасьці



Кангрэсмэн ЗША Джон Шымкус, Вашынгтон



Фэлікс Шкірманкоў, актывіст Беларускага Народнага Фронту, вэтэран Другой сусьветнай вайны, Слаўгарад



Барыс Хамайда, грамадзкі актывіст, Віцебск



Міністар замежных справаў і першы віцэ-прэм’ер Чэхіі
Карэл Шварцэнбэрг (сядзіць), супрацоўнікі “Радыё Свабода”, Прага




Алег Рудакоў, актывіст беларускай дыяспары, папулярызатар беларускай культуры і традыцый, Іркуцк



Дэвід Сўорц, першы амбасадар ЗША ў Беларусі



Зінаіда Клыга, сябра Рады БНР і старшыня Беларуска-эстонскага згуртаваньня Іду-Вірумаа (БЭЗ), атрымоўвае Ордэн Белае зоркі ад прэзыдэнта Эстоніі Керсты Кальюлайд, 22 лютага 2019 г.



Сакратар Рады БНР Вячаслаў Бортнік ускладае кветкі ад Рады БНР у Курапатах, верасень 2019 г.




Сайт Рады БНР – www.radabnr.org




Старонка Рады БНР у Facebook
www.facebook.com/radabnr







Старонкі Рады БНР у Instagram і Twitter

www.instagram.com/bnr_rada

www.twitter.com/radabnr



Набажэнства ў Базыльянскіх мурах з удзелам радных БНР,
Вільня, 23 лістапада 2019 г.



Старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла сярод удзельнікаў беларускага набажэнства ў Касьцёле сьв. Баўтрамея ў Вільні, 24 лістапада 2019 г.



Праца XXX Сэсіі Рады БНР, Вільня, 23 лістапада 2019 г.



Удзельнікі XXX Сэсіі Рады БНР, Вільня, 23 лістапада 2019 г.

# Дакумэнты

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

26 лютага 2017 г.

**Заява**

**Рада БНР заклікае спыніць будаўніцтва ў Курапатах**

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі занепакоеная чарговым наступам на Курапаты – месца расстрэлаў ахвяраў камуністычных рэпрэсій.

У Курапатах з канца 1930-х па 1941 год былі зьнішчаныя дзясяткі тысяч людзей – у іх ліку і некаторыя заснаваньнікі Беларускай Народнай Рэспублікі. Ва ўрочышчы гвалтоўна скончыўся зямны шлях ня толькі прадстаўнікоў беларускай эліты, але і рабочых, сялянаў – і таму гэтае злачынства мае прыкметы генацыду над нацыяй.

Курапаты – ня толькі месца смутку, але і сымбаль адраджэньня нацыі, бо менавіта іх адкрыцьцё ў канцы 1980-х гадоў абудзіла беларускі народ і ўзьняло яго на барацьбу за аднаўленьне Незалежнасьці.

У 1988 годзе Рада БНР спрычынілася да распаўсюду ў сьвеце інфармацыі адкрывальніка Курапатаў Зянона Пазьняка. Тады вядучыя выданьні сьвету зьмясьцілі публікацыю пра раскопкі пад Менскам, і гэта выявіла перад сьветам сапраўднае, антычалавечае аблічча савецкай улады.

У 2001-2002 гадох Рада БНР падтрымала абаронцаў Курапатаў, якія дамагліся спыненьня будаўніцтва аўтарстрады праз урочышча.

Сёньня, выказваючы падтрымку самаахвярнай беларускай моладзі і яе імкненьню захаваць недатыкальнасьць сьвятога для ўсіх патрыётаў месца, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі заклікае спыніць якое-кольвек будаўніцтва ў межах раней вызначанай ахоўнай зоны.

Курапаты маюць агульнанацыянальнае значэньне для Беларусі і павінны быць адным з галоўных мэмарыяльных месцаў у нашай краіне, нароўне з Хатыньню і Малым Трасьцянцом. Будаўніцтва на тэрыторыі ўрочышча Курапаты – на магілах тысячаў нашых землякоў, бязьвінных ахвяраў таталітарнага рэжыму – зьяўляецца злачынствам супраць памяці продкаў, супраць Беларусі і беларускага народу. Ніякімі камэрцыйнымі або іншымі інтарэсамі такое будаўніцтва ня можа быць апраўданае.

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

КАНЦЫЛЯРЫЯ СТАРШЫНІ

23 сакавіка 2017 г.

**Зварот Старшыні Рады БНР да беларускага народу з нагоды Дня Волі**

Шаноўныя суродзічы, дарагія сябры-беларусы!

Ад імя Рады Беларускай Народнай Рэспублікі віншую вас з нашым вялікім нацыянальным сьвятам! У гэты дзень, 25 сакавіка 1918 г., пасьля доўгай няволі, калі вонкавы сьвет забыўся пра нашае існаваньне, народ наш заявіў, што хоча жыць у сваёй незалежнай дзяржаве.

Давялося чакаць яшчэ больш як сем дзесяцігодзьдзяў, пакуль Беларусь сталася ўсімі прызнанай дзяржавай, але калі б не было ў сакавіку 1918 году людзей, якія моцна верылі ў свае права быць вольнымі на сваёй зямлі, – не здабылі б мы ў жніўні 1991-га сваёй дзяржавы.

Дарагія сябры, праз год, 25 сакавіка 2018 г., мы адзначым 100–гадовы юбілей абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. У нармальнай дэмакратычнай краіне, дзяржава рыхтавалася б да вялікага сьвята – але цяпер, на жаль, настрой не сьвяточны. У гэтым 2017 годзе наш край ізноў апынуўся пад пагрозай быць зьняволеным тым самым захопнікам. Разьвіцьцё апошнім часам падзеяў вельмі трывожнае. Перад мілітарызацыяй нашай зямлі расейскімі базамі і манэўрамі з удзелам тысячаў расейскіх вайскоўцаў, Беларусь успрымаецца Захадам верным саюзьнікам Масквы, і падзел паміж двума сьветамі пакідае нас штораз часьцей на баку варожай нам імпэрыі. У выпадку вайны наш народ ізноў зробіцца першай яе ахвярай.

Зьвяртаюся сёньня да беларускага народу, у Беларусі і ўва ўсім сьвеце. Гэтак, як нашая гераічная моладзь, якая нядаўна бараніла Курапаты,

скажыце ўсяму сьвету і прамаскоўскім хаўрусьнікам у Менску, што беларускі народ не зьбіраецца ізноў паміраць за чужыя імпэрыі, што край наш выбраў нэўтралітэт, калі ён меў магчымасьць выказаць сваю волю, і што ён быў уцягнуты ў варожую нам Эўразійскую зону, нягледзячы на гэтае жаданьне, выказанае ў Канстытуцыі.

У гэты вельмі неспакойны час, калі кожная дзяржава мае свае ўласныя клопаты і ня мае часу прыслухоўвацца да чужых праблемаў, цяжка пераканаць тых, хто гэтага ня ведае, што мілітарныя базы на сваёй зямлі мы ўспрымаем – як пагрозу незалежнасьці нашай дзяржавы.

Аднак пра гэта трэба гаварыць, трэба пісаць усім нам як індывідуальна, гэтак і калектыўна, ад імя беларускіх арганізацыяў, звароты да ўрадаў краінаў, дзе мы пражываем. Трэба рабіць усё магчымае, каб нас бачылі, каб нас чулі, каб ведалі, што народ наш ізноў пад пагрозай з боку суседа, злачынную небясьпеку якога сьвет нарэшце зразумеў. Трэба, каб лінія абароны Эўропы праходзіла ня ўздоўж заходняй мяжы Беларусі з Эўразьвязам, а ўздоўж мяжы ўсходняй – з Расеяй.

Дарагія мае суродзічы на Бацькаўшчыне, трэба, каб вы таксама заявілі сьвету, што вы ізноў быць калёніяй Масквы не зьбіраецеся. З сумам канстатую, што трэба быць героем, каб у Беларусі змагацца за волю нашай зямлі. З глыбіні сэрца віншую тых, хто гэта штодзённа робіць. Сьвет пра вашае змаганьне ведае. Воля і Незалежнасьць Беларусі, у першую чаргу – у вашых руках!

Жыве Беларусь!

**Івонка Сурвілла,**
**Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі**

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

25 сакавіка 2017 г.

**Заява**
**Рада БНР асуджае гвалт супраць дэманстрантаў, заклікае ўжыць палітычны і эканамічны ціск на прарасейскі рэжым у менску**

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі рашуча асуджае гвалтоўныя дзеяньні сілавых структураў лукашэнкаўскага рэжыму супраць грамадзянаў падчас мірных дэманстрацыяў 25 сакавіка 2017 году.

Дзень Волі – галоўнае сьвята беларускага народу і гадавіна падзеі, ад якой бярэ адлік гісторыя сучаснай беларускай дзяржаўнасьці. У гэты дзень Беларусь упершыню абвесьціла сябе незалежнай дэмакратычнай дзяржаваю. У будучыні гэты дзень без сумневу будзе галоўным дзяржаўным сьвятам Беларусі.

Перашкаджаючы беларусам сьвяткаваць 25 сакавіка, дыктатарскі рэжым на чале з грамадзянінам Аляксандрам Лукашэнкам, які мінімум ад 1999 году незаконна займае пасаду Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, у чарговы раз прадэманстраваў сваю антыбеларускую і антыдэмакратычную натуру, а таксама сваю беспасярэднюю пераемнасьць з таталітарнай савецкай акупацыйнай уладай.

Злачынствам, зьдзейсьненым пэрсанальна Аляксандрам Лукашэнкам, а таксама асобамі, што бяруць удзел у рэпрэсіях супраць грамадзянаў Беларусі, у будучыні будзе дадзеная адпаведная юрыдычная ацэнка, як гэта адбылося ўва ўсіх іншых краінах Усходняй Эўропы пасьля іхнага вызваленьня з-пад савецкай акупацыі або просавецкіх камуністычных дыктатураў.

Рада БНР патрабуе неадкладнага вызваленьня ўсіх актывістаў, арыштаваных 25 сакавіка і напярэдадні, чый лік складае некалькі соцень чалавек.

Рада БНР зьвяртае ўвагу міжнароднай супольнасьці на факты далейшых яскравых парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, адсутнасьць будзь-якога прагрэсу ў справе дэмакратызацыі.

Рада БНР заклікае краіны Эўрапейскага Зьвязу, Злучаныя Штаты Амэрыкі, Канаду і іншыя краіны Вольнага Сьвету ажыцьцявіць актыўны палітычны і эканамічны ціск на прарасейскую дыктатуру ў Беларусі з мэтай неадкладнай дэмакратычнай трансфармацыі і павагі да правоў чалавека ў Беларусі.

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

КАНЦЫЛЯРЫЯ СТАРШЫНІ

14 ліпеня 2017 г.

**Зварот Старшыні Рады БНР**
**да дэлегатаў 7. Зьезду беларусаў сьвету**

Дарагія суродзічы-беларусы!

Ад імя Рады Беларускай Народнай Рэспублікі вітаю вас з гэтым, ужо сёмым па ліку, Зьездам беларусаў сьвету.

Ці прыехалі вы з далёкага замежжа, альбо завіталі на Зьезд па-суседзку з блізкіх мясьцінаў Беларусі, усе вы прадстаўляеце беларускі народ. Кожны з вас увасабляе, па-свойму, якісьці ўнікальны аспэкт нашай Бацькаўшчыны.

Беларусь існуе дзякуючы ўсім нам, дзе б мы ні знаходзіліся. Нашай дзейнасьцю, нашымі паводзінамі, высілкамі, якія мы робім, каб здабыць сяброў для нашага прыгожага краю, кожны з нас спрычыняецца да зьдзяйсьненьня нашай супольнай мэты: каб Беларусь заняла сваё пачэснае месца між іншымі народамі сьвету. Каб нашая краіна сталася той Бацькаўшчынай, якой кожны з нас будзе магчы ганарыцца і якую сьвет прызнае ня дзеля яе бедаў, а дзеля яе годнасьці, яе прыгажосьці, і дзеля каштоўнасьцяў, якія яна дала чалавецтву.

Дарагія беларусы замежжа, эміграцыя, экзыль – вялікія выпрабаваньні для кожнага чалавека. Але, калі мы здолеем захаваць сваё пачуцьцё прыналежнасьці, яны нас зробяць мацнейшымі беларусамі, гатовымі змагацца за лепшую долю нашага народу.

Гісторыя неаднойчы сьведчыла, што беды ня ёсьць вечныя. Таму і мы мусім верыць, што і высілкі кожнага з нас урэшце перамогуць усе перашкоды на нашым шляху! Дык дапамажы нам Божа!

А ў міжчасе, жадаю ўсім вам шчасьліва правесьці гэтыя дні а мо і тыдні на Бацькаўшчынне і вярнуцца з новымі сіламі для працы на карысьць свайго народу.

Жыве Беларусь!

**Івонка Сурвілла,**
**Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі**

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

КАНЦЫЛЯРЫЯ СТАРШЫНІ

24 лістапада 2017 г.

**Зварот Старшыні Рады БНР**
**да Дня Герояў – 2017**

Дарагія суродзічы!

У лістападзе шмат якія народы ўшаноўваюць памяць сваіх герояў. Прыкладам, а 11-ай гадзіне 11-га дня 11-га месяца ўся Канада аддае пашану хвілінай маўчаньня сваім змагарам. Ад прадстаўнічкі каралевы да вэтэранаў і звычайных грамадзянаў, старыя і маладыя, з удзячнасьцю прыгадваюць суайчыньнікаў, якія аддалі жыцьцё на алтар Бацькаўшчыны. Ускладаюцца вянкі на магілах невядомых жаўнераў і паўсюль адбываюцца адпаведныя абрады.

Беларускі народ да нядаўняга часу ня ведаў – бо было забаронена ведаць – пра сваіх першых герояў першай у XX стагодзьдзі беларускай дзяржавы, нашых слаўных Случчакоў, якія ў 1920 змагаліся за Беларускую Народную Рэспубліку. Толькі ў вольным сьвеце беларусы пра іх ведалі і з удзячнасьцю іх ушаноўвалі ў канцы лістапада.

У гэтым 2017 годзе ў Беларусі яшчэ ўсё трэба прасіць дазвол ў гарадзкіх управах, каб магчы ўшанаваць іх памяць. І паколькі ніколі не вядома, у якой ступені "чалавечкі ў цывільным" дазволяць спакойна адзначыць Дзень Герояў, выходзяць на вуліцы не дзесяткі тысяч, а толькі пару сотняў удзячных патрыётаў.

Дарагія суродзічы! Віншую вас сёньня ад імя Рады Беларускай Народнай Рэспублікі з гэтай вялікай падзеяй у жыцьці нашага народу – Слуцкім Збройным Чынам.

Успомніце з удзячнасьцю тых дзесяць тысяч Герояў, якія хацелі вас абараніць ад надыходзячага захопніка-чужынца. Яны на гэта заслужылі.

Вечная ім памяць!

Жыве Беларусь!

**Івонка Сурвілла,**
**Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі**

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

КАНЦЫЛЯРЫЯ СТАРШЫНІ

21 сьнежня 2017 г.

**Стагодні юбілей Усебеларускага зьезду – гэта стагодні юбілей Рады БНР.**

**Зварот Старшыні Рады БНР**

Дарагія радныя БНР, дарагія мае сябры і паплечнікі,

У гэтыя дні мы адзначаем стагодзьдзе важнай гістарычнай падзеі – Першага Ўсебеларускага Зьезду. Гэты кангрэс пачаўся 18 сьнежня (5 сьнежня па старым стылі) 1917 году. Ён праходзіў цягам амаль двух тыдняў галоўным чынам у будынку Менскага гарадзкога тэатру – цяперашняга Тэатру Янкі Купалы, які нядаўна набыў амаль той самы вонкавы від, які ён меў тады.

Той агульнанацыянальны зьезд быў адметны тым, што на ім было абвешчана пра ўтварэньне агульнабеларускага прадстаўнічага кіраўнічага органу. Гэты орган неўзабаве стаў называцца Радай Беларускай Народнай Рэспублікі, а 25 сакавіка 1918 году абвесьціў Беларусь незалежнай дзяржаваю.

Такім чынам, стагодні юбілей Усебеларускага зьезду – гэта стагодні юбілей Рады БНР. Я шчыра віншую ўсіх вас з гэтаю датай.

Роўна стагодзьдзе Рада БНР нясе сьцяг дэмакратычнай і сувэрэннай беларускай дзяржаўнасьці. Празь некалькі замежных акупацыяў. У выгнаньні ў Коўне, Празе і на Захадзе. Празь цяжкія цяперашнія часы прарасейскай дыктатуры Аляксандра Лукашэнкі, калі Беларусь хаця і

сталася фармальна незалежнаю, але знаходзіцца пад кантролем узурпатара, гатовага прамяняць сувэрэнітэт сваёй бацькаўшчыны на шанец заняць трон у Крамлі.

У дваццатым стагодзьдзі многія нашыя з вамі паплечнікі і калегі паплаціліся сваім жыцьцём за прыналежнасьць да Рады БНР і за сваю барацьбу за вольную Беларусь. Савецкімі акупантамі былі забітыя як мінімум дваццаць чатыры радных БНР, у тым ліку прынамсі чацьвёра прэм’ер-міністраў БНР і адзін Старшыня Рады БНР. Дзясяткі радных прайшлі празь зьняволеньне ў савецкім ГУЛАГу, цярпелі перасьлед ад гітлераўскіх акупантаў і ўладаў міжваеннай Польшчы.

Гісторыя даказала, што калябарацыя з вонкавымі акупантамі ня можа быць пасьпяховаю. Беларускія структуры, створаныя, хай нават з найлепшымі памкненьнямі, пад эгідай міжваенных польскіх уладаў, ці, тым болей, нямецкіх нацыстаў, пацярпелі паразу. Паплаціліся за сваю трагічную памылку і тыя беларускія дзеячы, хто паверыў бальшавікам і вярнуўся з эміграцыі ў марыянэткавую БССР.

Рада БНР як структура заўжды падкрэсьлівала сваю незалежнасьць і ставіла беларускія нацыянальныя інтарэсы вышэй за ўсё. Дзякуючы гэтаму яна выстаяла.

Цягам дзесяцігодзьдзяў Рада БНР была галоўным прадстаўніком Беларусі ў Вольным сьвеце. Яна гуртавала беларускую палітычную эміграцыю, якая па сутнасьці складала асноўную частку несавецкае беларускае палітычнае апазыцыі і грамадзкае эліты, што была вымушаная зьехаць зь Беларусі, каб пазьбегнуць сьмерці ў сталінскіх канцэнтрацыйных лягерах. Перад Радаю БНР стаяла задача ня проста ўсталяваць кантакты з урадамі дэмакратычных краінаў, але і данесьці да іх інфармацыю пра Беларусь, пра тое, што мы самастойны народ з уласнымі гісторыяй, культурай і інтарэсамі, які хоча жыць ува ўласнай дэмакратычнай дзяржаве ў міры з суседзямі.

Праз стагодзьдзе Рада БНР зьмяніла фармат сваёй працы. Дзякуючы сучасным тэхналёгіям мы працуем і ўзаемадзейнічаем, знаходзячыся на розных кантынэнтах. Рада БНР працягвае аб’ядноўваць найбольш выбітных палітычных актывістаў сярод прадстаўнікоў беларускай дыяспары па ўсім

сьвеце. Статус раднага БНР – гэта пачэсны, ганаровы статус, які адначасова падкрэсьлівае дасягненьні чалавека, але і накладае на яго дадатковыя абавязкі: перадусім, абавязак быць годным тых, хто ўваходзіў у склад нашае структуры раней.

Зьмяняюцца пакаленьні радных БНР. Цяпер у нашых шэрагах і прадстаўнікі старога пакаленьня эміграцыі, і вымушаныя зьехаць зь Беларусі палітычныя актывісты й дэпутаты, і прадстаўнікі другога пакаленьня беларускай дыяспары. Найбольш маладыя цяперашнія радныя на сто гадоў маладзейшыя за тых людзей, хто стаяў ля вытокаў нашае структуры ў 1917 годзе. Рада БНР была і застаецца адкрытаю да супрацоўніцтва з усімі, каму неабыякавы лёс Беларусі.

Да той працы, якую Рада БНР рабіла ў часы савецкай акупацыі і якая ўключала прадстаўніцтва Беларусі ў замежжы, камунікаваньне з урадамі дэмакратычных краінаў дзеля прыцягненьня ўвагі да праблемаў Беларусі, цяпер далучылася і беларуская дэмакратычная апазыцыя. Шмат непасярэднай працы з урадамі і грамадзтвамі ў асобных краінах узялі на сябе арганізацыі беларускай дыяспары, чыіх прадстаўнікоў Рада БНР імкнецца аб’ядноўваць.

Але функцыя Рады БНР, якую ніхто ня зможа выконваць за нас, – гэта працягненьне традыцыяў беларускага дэмакратычнага і незалежніцкага руху. Гэта забесьпячэньне юрыдычнае пераемнасьці паміж беларускай дзяржавай і воляй беларускага грамадзтва, выказанай на Першым Ўсебеларускім Зьездзе 1917 г. і ўва Ўстаўных Граматах 1918 году.

Рада БНР – гэта жывая гісторыя і бадай што самая старая дзеючая беларуская палітычная структура. Захоўваць гэты інстытут, гэтую беларускую гістарычную каштоўнасьць – гэта вялікі гонар і вялікая адказнасьць.

Нашая мэта – перадаць наш гістарычны мандат, атрыманы роўна сто гадоў таму на Ўсебеларускім Зьезьдзе, дэмакратычна абранай беларускай уладзе пры ўмовах гарантаванай незалежнасьці Беларусі. І нашыя высілкі былі й будуць надалей скіраваныя на тое, каб Беларусь як найхутчэй заняла свой пачэсны пасад між эўрапейскімі народамі.

**Івонка Сурвілла**
**Старшыня Рады БНР**

# РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

КАНЦЫЛЯРЫЯ СТАРШЫНІ

13 студзеня 2018 г.

## Год БНР
## Ліст Старышні Рады БНР да беларускага народу

Дарагія мае суродзічы ў Беларусі і ў сьвеце!

Віншую Вас з Новым 2018 годам і жадаю, каб гэты вялікі наш юбілей – 100-годзьдзе абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі — быў для ўсіх нас пасьпяховым і шчасьлівым.

У 2017 годзе Канада сьвяткавала свае стопяцідзесятыя ўгодкі. І як прыемна было бачыць, што ня толькі ўлады, але і кожны горад, кожнае мястэчка, кожная вёска адзначалі гэты юбілей. Людзі ўдзельнічалі ў афіцыйных імпрэзах, але таксама стараліся з гэтай нагоды зьдзейсьніць нейкія юбілейныя праекты, адсьвяткаваць юбілей асабіста, кожны па-свойму.

Дык вось, зьвяртаюся да вас сёньня з заклікам: давайце і мы, усе мы, у Беларусі і ў замежжы, адзначым наш Юбілей – сто гадоў адноўленага існаваньня нашай дзяржавы. Пачатак быў нялёгкі, ва ўмовах вайны на нашай зямлі між чужымі нам імпэрыямі, ва ўмовах дагавораў між імі, у якіх іы ня бралі ўдзелу. Але нашыя продкі ўсё ж здолелі абвясьціць сьвету, што беларускі народ жыве і жадае быць незалежным, паўнавартасным гаспадаром свае зямлі.

Дзякуючы адвазе і вытрываласьці нашых продкаў, незалежнасьць Беларусі была абвешчаная, прызнаная суседзямі, і нават бальшавікі ня здолелі зноў зрабіць з нас расейскую губэрнію. Усе мы ведаем, што без БНР не было б БССР і сёньня не існавала б незалежная дзяржава – Рэспубліка Беларусь.

Беларуская дыяспара адзначала 25 Сакавіка як найвялікшае сваё сьвята. Там, дзе былі сьвятыні, адпраўлялі малебен за Беларусь, якія заўсёды завяршаліся малітвай “Магутны Божа”. Дзеці чыталі вершы, выступалі са сьпевамі. Дарослыя зь цікавасьцю слухалі даклады на тэму абвяшчэньня незалежнасьці БНР. Рабілі іх найбольш паважаныя дзеячы эміграцыі. Часта чула словы, менавіта калі дзень 25 Сакавіка зьбліжэўся да Вялікадня: “Хрыстос уваскрос, уваскрэсьне і наша Беларусь!”. Рабілі супольныя абеды, ладзілі выставы беларускага народнага мастацтва. Усё гэта напаўняла сэрца радасьцю і верай, што “дачакаемся”.

У гэтыя сотыя угодкі БНР, заклікаю кожнага з Вас, мае дарагія суродзічы, адзначыць падзеі 1918 году на нашай зямлі гэтак, як адзначаюць такія сьвяты грамадзяне вольных краінаў. Або ўрачыстымі сустрэчамі, прысьвечанымі БНР, канцэртамі, гутаркамі, імпрэзамі. У замежжы, дык я абсалютна ўпэўненая, што прынамсі 25 Сакавіка адсьвяткуюць урачыста і з радасьцю. Забудземся ў гэты дзень на тое, што яшчэ не нармальна ў нашым краі, бо верым, што дачакаемся і мы тае вольнай, беларускай Беларусі, пра якую ўсе марым.

Што да асабістых праектаў, прысьвечаных стагодзьдзю БНР, прапаную, каб нашыя мастакі зарганізавалі ў 2018 годзе выставу, прысьвечаную Беларускай Народнай Рэспубліцы, каб паэты выказалі сваю любоў да Бацькаўшчыны ў сваіх юбілейных вершах, каб пісьменьнікі выдалі нарысы на тэму стагодзьдзя. І каб дзеткі ў школах папрасілі настаўнікаў расказаць ім пра падзеі ў Менску стогадовай даўніны, пра значнасьць незалежнасьці для кожнага народу, пра месца БНР у нашай гісторыі. Мяне вучылі пра ўсё гэта мае бацькі. Зьвяртаюся да нашай дыяспары – мо і вы перадалі б сваім дзеткам пачуцьцё гонару звацца беларусамі, якое перадалі нашыя бацькі майму брату і мне ў далёкім замежжы?

Дык вітаю ўсіх вас, мае дарагія суродзічы, і жадаю, каб гэты юбілейны год БНР быў для вас асабліва плённым і шчасьлівым!

Жыве Беларусь!

**Івонка Сурвілла,**
**Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі**

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

5 лютага 2018 г.

**Заява**
**Памяці Барыса Кіта**

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі выказвае свой смутак з нагоды сьмерці Барыса Кіта – знакамітага навукоўца і беларускага патрыёта.

Барыс Кіт быў сучасьнікам, сьведкам і ўдзельнікам найбольш драматычных старонак беларускай гісторыі дваццатага стагодзьдзя.

Ён быў адным з апошніх жывых грамадзянаў Беларускай Народнай Рэспублікі 1918 году, апошнім жывым яскравым прадстаўніком пакаленьня беларускіх актывістаў у міжваеннай Заходняй Беларусі. Ён быў выкладчыкам і дырэктарам легендарнай Віленскай беларускай гімназіі, выпускнікамі якой сталі многія выбітныя беларускія дзеячы. Ён перажыў савецкую акупацыю ў 39-41 гг. і нямецкую акупацыю ў 41-44 гадах, ледзьве выратаваўшыся ад расправы з боку нацыстаў. Жыцьцёвы шлях Барыса Кіта – гэта шлях ўсяго беларускага руху апошняга стагодзьдзя: складаны, пакручасты, і ўрэшце пераможны.

Сваёй выбітнай міжнароднай навуковай кар’ерай пасьля вайны Барыс Кіт стаўся сымбалем таго, як беларус можа дабіцца посьпеху ў сьвеце, пры гэтым не губляючы сувязі з Бацькаўшчынай. Барыс Кіт – натхняльны прыклад для ўсіх нас, для тысячаў беларусаў у замежжы і для самой Беларусі. Ён паказаў, што мы можам дасягнуць міжнароднага прызнаньня, будучы вернымі сваім ідэалам, ідэалам 25 сакавіка і вольнай дэмакратычнай Беларусі, як быў ім да самога канца верны Барыс Кіт.

Нас пакінула сапраўды ўнікальная асоба.

Рада Беларускае Народнае Рэспублікі выказвае свае спачуаньні родным і сябрам Барыса Кіта.

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

КАНЦЫЛЯРЫЯ СТАРШЫНІ

25 сакавіка 2018 г.

## Зварот Старшыні Рады БНР да 100-годзьдзя абвяшчэньня Незалежнасьці Беларусі

Дарагія мае суродзічы, дарагія сябры-беларусы!

Ад імя Рады Беларускай Народнай Рэспублікі вітаю вас з стагодзьдзем!

Сьвяткуем мы сёньня ня толькі юбілей таго слаўнага 25-га сакавіка 1918 году, калі народ наш абʼявіў сьвету, што “скідае апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасьці”, але і стагодзьдзе змаганьня, часта ў вельмі цяжкіх умовах, каб ажыцьцявіць ідэалы 25 Сакавіка.

Сёньня, сто год пасьля абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, Беларусь жыве і жывуць ідэалы 25 Сакавіка. Шлях наш быў цярністым, але мы выжылі, і не дазволілі згаснуць нашай паходні надзеі.

Дарагія сябры! Бяз гэтай паходні надзеі не аднавілі б мы незалежнасьці Рэспублікі Беларусь ў 1991-м годзе, бо не было б ужо каму яе аднаўляць. Не было б БНР, не было б БССР, не было б і незалежнай дзяржавы Беларусь.

Але ідэалаў БНР мы яшчэ ня зьдзейсьнілі. Беларускі дом яшчэ ўсё ня зусім беларускі, і незалежнасьць яго яшчэ ўсё пад пагрозай.

Ці знойдзе наш народ сілы адбудаваць яго зь сярэдзіны? Ці хопіць у нас вытрываласьці, каб адбудоўваць яго, пакуль не адродзім назаўсёды “жыцьцё рэспублікі сваей”? Ці перажытае прамываньне мазгоў чужой прапагандай дазволіць нашым людзям прызнаць, што былі яны анямелымі ахвярамі чужога захопніка?

І ці зразумее народ, што будучыня ў яго руках і што ад яго залежыць, ці Беларусь станецца заможнай краінай Эўропы, ці застанецца эксплюатаванай калёніяй замежных недобразычліўцаў.

Дарагія Суродзічы! Ідэалы БНР жывуць і будуць жыць. Але ад кожнага з нас залежыць, калі мы іх зьдзейсьнім.

Дык давайце скарыстаем з гэтага вялікага Юбілею, каб даказаць сабе і сьвету, што мы іх годныя.

Жыве Беларусь!

**Івонка Сурвілла**
**Старшыня Рады БНР**

# РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

КАНЦЫЛЯРЫЯ СТАРШЫНІ

25 красавіка 2018 г.

## Ліст ад Старшыні Рады БНР з нагоды ўрачыстасьцяў да 100-годзьдзя БНР у сьвеце

Дарагія Суродзічы, дарагія Сябры Беларусы!

Пішу гэты ліст перад усім, каб выказаць маю ўдзячнасьць пасьля сьвяткаваньняў у Беларусі і ў сьвеце сотых угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі 25-га Сакавіка 1918 году.

Я яшчэ ўсё пад уражаньнем урачыстасьцяў і энтузіязму, зь якім вы адзначылі стагодзьдзе БНР. Ведаю, што будзе яшчэ шмат мерапрыемстваў у 2018 годзе з гэтае нагоды, але хочацца вам ужо цяпер падзякаваць за радасьць, якою вы напоўнілі маё сэрца ў Сакавіку 2018 г.

Хачу вам падзякаваць за тыя цудоўныя сьвяткаваньні, на якіх я прысутнічала асабіста ў Атаве, у Лёндане і ў Празе, і за ўсе тыя, на якіх я не змагла прысутнічаць. Удзячная вам за вялізарную працу якую вы ўлажылі, каб зрабіць гэтыя сьвяткаваньні годнымі вялікай падзеі, якой былі сотыя ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці БНР. Удзячная ўсім, хто прыйшоў на сьвяткаваньні, каб належна адзначыць Стагодзьдзе БНР.

Ганаруся нашым народам, які ўжо сто год беражэ ідэалы БНР. Ганаруся нашай моладзьдзю, якая з такім уздымам выказала сваю любоў да Бацькаўшчыны! Удзячная таксама ўсім тым, хто прадаўжае сьвяткаваць Стагодзьдзе. Перад намі яшчэ восем месяцаў гэтага юбілейнага году! Яшчэ

столькі магчымасьцяў выказаць нашую вернасьць ідэалам БНР і задумацца над тым, як кожны з нас можа спрычыніцца да іх зьдзейсьненьня.

Вітаю ўсіх вас ад імя Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, мае дарагія Сябры!

Жыве Беларусь!

**Івонка Сурвілла**
**Старшыня Рады БНР**

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

19 чэрвеня 2018 г.

**Заява**

**Рада Беларускай Народнай Рэспублікі заклікае захаваць недакранальнасьць Курапатаў**

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі выказвае сваё абурэньне фактам перагляду ахоўнай зоны Курапацкага мэмарыялу і адкрыцьця забаўляльных установаў на ягонай тэрыторыі.

Курапаты – адзін з галоўных гістарычных помнікаў і мэмарыялаў на тэрыторыі Беларусі.

На тэрыторыі ўрочышча Курапаты савецкія акупанты ў трыццатыя і саракавыя гады мінулага стагодзьдзя расстралялі тысячы мірных жыхароў Беларусі. Гэтае месца зьяўляецца галоўным нацыянальным мэмарыялам, дзе ўшаноўваюцца ахвяры савецкага рэжыму на Беларусі. Апроч гэтага, у 1988 годзе Курапаты сталіся знакавым месцам для фармаваньня агульнанацыянальнага дэмакратычнага руху, які зрабіўся асноўнай сілай, што спрычынілася да зьяўленьня на карце сьвету незалежнай Рэспублікі Беларусь у 1991 годзе.

Савецкія акупацыйныя ўлады і постсавецкі рэжым Аляксандра Лукашэнкі неаднаразова дэманстравалі сваё жаданьне зганьбіць Курапаты, а таксама сьцерці народную памяць аб гэтым месцы і страшных падзеях, якія там адбываліся, праз:

замоўчваньне савецкіх злачынстваў і наўмысны распаўсюд хлусьні аб Курапатах у дзяржаўных СМІ,
будаўніцтва аўтамабільнай шашы непасярэдна па магілах ахвяраў рэпрэсій,

дэманстратыўнае нерасьследваньне фактаў наўпроставага вандалізму і нападаў на добраахвотнікаў, што займаюцца ўпарадкаваньнем мэмарыяла,
– а, магчыма, і арганізацыю вандалізма і правакацыяў,
неналежную ахову мэмарыяла,
дазвол на будаўніцтва рэстарану на тэрыторыі Курапатаў.
Рада БНР заяўляе, што пабудова забаўляльных установаў на месцы масавых расстрэлаў і пахаваньняў ахвяраў рэпрэсій, а таксама перагляд ахоўных межаў мэмарыяла зьяўляюцца злачынствам супраць нацыянальнай памяці.

Рада БНР выказвае сваю падтрымку і шчырую падзяку ўсім, хто асабіста ўдзельнічае ў акцыях пратэсту на месцы і спрыяе пашырэньню інфармацыі пра тое, што адбываецца ў Курапатах.

Рада БНР заяўляе, што маўклівая згода афіцыйных уладаў Рэспублікі Беларусь на зганьбаваньне Курапатаў у чарговы раз сьведчыць аб тым, што рэжым Аляксандра Лукашэнкі ў важных аспэктах па-ранейшаму захоўвае характар палітычнага пераемніка акупацыйнага савецкага рэжыму. На працягу вось ужо больш за дваццаць гадоў маральная і ідэйная пераемнасьць рэжыма А. Лукашэнкі і савецкага рэжыму праяўляецца як у сымбалічнай прасторы, так і на практыцы, праз сыстэматычныя парушэньні правоў чалавека, адсутнасьць дэмакратычных выбараў, адкрытую пагарду да годнасьці беларусаў як грамадзянаў і і да ключавых складнікаў беларускай нацыянальнай памяці і годнасьці. Палітыка ў справе мэмарыялу ахвярам савецкага тэрора ў Курапатах відавочна і востра супярэчыць пазытыўным жэстам з боку кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь, якія маглі былі быць з надзеяй успрынятыя беларускім дэмакратычным грамадзтвам і дыяспарай у кантэксьце адзначэньня 100-годдзя незалежнасьці БНР у сакавіку гэтага году.

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

29 чэрвеня 2018 г.

**Заява**

**Візыт прэзыдэнтаў Нямеччыны і Аўстрыі будзе выкарыстаны для легітымацыі рэжыма А. Лукашэнкі**

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі выказвае заклапочанасьць тым, што візыт у Беларусь Прэзыдэнта Фэдэральнай Рэспублікі Нямеччына Франка-Вальтэра Штайнмаера і Прэзыдэнта Аўстрыйскае Рэспублікі Аляксандра ван дэр Бэллена 29 чэрвеня 2018 будзе выкарыстаны для легітымацыі дыктатарскага рэжыма Аляксандра Лукашэнкі.

Рада БНР вітае ўшанаваньне памяці ахвяраў нацыстоўскіх акупантаў з боку афіцыйных уладаў Рэспублікі Беларусі, а таксама з боку кіраўнікоў Нямеччыны і Аўстрыі. Трасьцянец — гэта месца, дзе былі забітыя дзясяткі тысячаў жыхароў Беларусі, Нямеччыны, Аўстрыі, Чэхіі і іншых краінаў. Гэтае месца сымбалізуе трагедыю жыхароў Беларусі — этнічных беларусаў, габрэяў і прадстаўнікоў іншых народаў — у XX стагодзьдзі, якая неаддзельная ад трагедыі ўсяе Эўропы. Памяць пра ахвяры Галакосту і Другой Сусьветнай Вайны павінна быць грунтам для агульнаэўрапейскай салідарнасьці і супольнага агульнаэўрапейскага супраціву тыраніі, нецярпімасьці, агрэсіўнаму нацыяналізму і распальваньню войнаў як у Эўропе, так і ў іншых рэгіёнах сьвету.

Рада БНР выказвае спадзяваньне, што ў будучыні такога самага афіцыйнага ўшанаваньня з боку як беларускіх уладаў, так і прадстаўнікоў Расеі як правапераемніка СССР, дачакаюцца і ахвяры савецкага рэжыму ў Беларусі, у тым ліку пахаваныя на тэрыторыі ўрочышча Курапаты.

Разам з тым Рада БНР адзначае, што міжнародная легітымацыя рэжыма А. Лукашэнкі будзе мець выключна нэгатыўны эфэкт на стан правоў чалавека

і дэмакратыі ў Беларусі. А. Лукашэнка прызнаваўся ў шанаваньні гітлераўскіх мэтадаў дзяржаўнага кіраваньня і пабудаваў у Беларусі сыстэму аўтарытарнай дзяржаўнай улады, якая супярэчыць эўрапейскім каштоўнасьцям.

Рада БНР заяўляе, што сустрэчы міжнародных лідараў з А. Лукашэнкам, які прынамсі з 1999 году незаконна займае пасаду Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, павінны быць скіраваныя на паляпшэньне сытуацыі з дэмакратыяй і правамі чалавека ў Беларусі. Паляпшэньне гэтае сытуацыі павінна быць неабходнай умовай для разьвіцьця стасункаў паміж дэмакратычнымі краінамі і Рэспублікай Беларусь.

RADA OF THE BELARUSIAN DEMOCRATIC REPUBLIC

29. Juni 2018

## Erklärung des Rates der der Weißruthenischen Volksrepublik

## Der Besuch der Präsidenten von Deutschland und Österreich nach Belarus wird zur Legitimierung des Regimes von Alaksandr Lukaschenka missbraucht werden

Der Rat der Weißruthenischen Volksrepublik (Rada BNR) ist besorgt darüber, dass der Besuch des Bundespräsidenten der Bundesrepublik Deutschland Frank-Walter Steinmeier und des Bundespräsidenten der Republik Österreich Alexander van der Bellen nach Belarus am 29. Juni 2018 zur Legitimierung das autoritären Regimes von Alaksandr Lukaschenka genutzt sein wird.

Rada BNR begrüßt das Gedenken an die Opfer der Nationalsozialisten seitens der offiziellen Behörden der Republik Belarus und der Staatsoberhäupter von Deutschland und Österreich. Trascianiec ist ein Ort, wo Zehntausende von Menschen aus Belarus, Deutschland, Österreich, der Tschechischen Republik und anderen Ländern ermordet wurden. Dieser Ort symbolisiert die Tragödie der Einwohner von Belarus – ethnischer Weißruthenen, Juden und Vertreter anderer Nationen – im 20. Jahrhundert, die von der Tragödie von ganz Europa untrennbar ist. Das Gedenken an die Opfer des Holocaust und des Zweiten Weltkrieges soll als Grundlage für europäische Solidarität und gemeinsamen paneuropäischen Widerstand gegen Tyrannei, Intoleranz und aggressiven Nationalismus sowie Kriegstreiberei sowohl in Europa, als auch in anderen Regionen der Welt dienen.

Rada BNR hofft, dass in Zukunft die gleiche offizielle Verehrung seitens der belarussischen Behörden und der Vertreter der Russischen Föderation als Nachfolgestaat der UdSSR auch den Opfern des sowjetischen Regimes in Belarus, einschließlich jener, die auf dem Massenvernichtungsort Kurapaty begraben sind, geleistet sein wird.

Allerdings stellt Rada BNR auch fest, dass die internationale Legitimation des Lukaschenka-Regimes ausschließlich negative Auswirkungen auf den Zustand der Menschenrechte und der Demokratie in Belarus haben wird. A. Lukaschenka hat öffentlich Lob für hitlersche Führungspraktiken ausgedruckt und in Belarus ein autoritäres Machtsystem errichtet, die den europäischen Werten widerspricht.

Rada BNR erklärt, dass Kontakte von hochrangigen internationalen Politikern mit Alaksandr Lukaschenka, der mindestens seit 1999 illegal das Amt des Präsidenten der Republik Belarus ausübt, auf die Verbesserung der Lage mit Demokratie und Menschenrechten in Belarus gerichtet sein sollten. Die Verbesserung dieser Situation sollte eine Voraussetzung für die Entwicklung der Beziehungen zwischen demokratischen Staaten und der Republik Belarus sein.

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

8 жніўня 2018 г.

**Заява**

**Праз 10 гадоў пасьля вайны ў Грузіі Расея працягвае пагражаць міжнароднай бясьпецы**

У гэтыя дні спаўняецца 10 гадоў вайне паміж Расеяй і Грузіяй у 2008 годзе.

Рада БНР канстатуе, што вайна сталася вынікам вонкавапалітычнай агрэсіі з боку Расеі, якая ад пачатку 1990-х гадоў аказвала матар’яльную і палітычную падтрымку сэпаратысцкім утварэньням на тэрыторыі Грузіі, выкарыстоўвала свой міратворчы мандат для прыкрыцьця гэтае падтрымкі і нарошчваньня вайсковае сілы ў Паўднёвай Асэтыі і Абхазіі. Рада БНР падкрэсьлівае, што Расея нясе адказнасьць таксама за падрыхтоўку і беспасярэдняе разьвязваньне баявых дзеяньняў у жніўні 2008 году.

Рада БНР падтрымлівае тэрытарыяльную цэласьць Грузіі ў міжнародна прызнаных межах і выказвае сваю салідарнасьць з народам Грузіі, які разам зь беларусамі пакутаваў ад дзесяцігодзьдзяў савецкае акупацыі, а пасьля распаду СССР таксама вымушаны супраціўляцца агрэсіўнаму рэваншызму з боку Расеі.

Рада БНР зьвяртае ўвагу, што вайна 2008 году сталася перадвесьнікам вайны ва Ўкраіне, якую пуцінская Расея разьвязала ў 2014 годзе. Вонкавапалітычная агрэсія постсавецкай Расеі сталася вынікам недастатковай рашучасьці міжнароднае супольнасьці ў рэагаваньні на ўмяшальніцтва ў справы суседніх краінаў з боку Расеі, а таксама недастатковай увагі міжнароднай супольнасьці да працэсаў дэмакратычнае трансфармацыі ў Расеі і іншых постсавецкіх краінах з пачатку дзевяностых гадоў.

Рада БНР зьвяртае ўвагу, што вайне ў Грузіі папярэднічаў дзяржаўны пераварот у Беларусі ў 1995-1996 гадах, які адбыўся пры падтрымцы Расеі і прывёў да ўсталяваньня прорасейскага аўтарытарнага рэжыму Аляксандра Лукашэнкі, адказнага за цэнзуру, фальсыфікацыю выбараў, масавыя парушэньні правоў чалавека і палітычныя рэпрэсіі, а таксама забойства палітычных апанэнтаў.

Рада БНР зьвяртае ўвагу на тое, што пуцінская Расея працягвае ўтвараць пагрозу міжнароднай бясьпецы і перадусім суседнім краінам, у тым ліку Беларусі.

Рада БНР заклікае да міжнароднай салідарнасьці і да супольнага адпору агрэсіўным дзеяньням Расеі пад кіраўніцтвам рэжыма Ўладзіміра Пуціна як на ўзроўне грамадзянскае супольнасьці, так і на дзяржаўным ўзроўні.

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

КАНЦЫЛЯРЫЯ СТАРШЫНІ

27 кастрычніка 2018 г.

**Выступ Старшыні Рады БНР**
**на сьвяткаваньні юбілею Згуртаваньня беларусаў Канады**

Дастойны Ўладыка Сьвятаслаў, шаноўныя госьці, дарагія сябры,

Ад імя Рады Беларускай Народнай Рэспублікі вітаю ўсіх нас зь юбілеем Згуртаваньня беларусаў Канады.

Як і ўва ўсіх іншых краінах, куды лёс іх закінуў, беларусы паваеннай хвалі эміграцыі ў Канадзе хутка пасьля свайго прыезду зьядналіся, перадусім каб разам працаваць на карысьць беларускага народу і разам змагацца за незалежнасьць Бацькаўшчыны.

Нават калі, у залежнасьці ад сваіх палітычных поглядаў, тварылі ў краіне некалькі беларускіх арганізацыяў, усе яны былі верныя ідэалам 25 сакавіка, усе стараліся стварыць “сваю Беларусь” на чужыне. Ад самага пачатку, заміж забясьпечваць уласнае існаваньне, яны браліся за здабычу сваіх сьвятыняў і грамадзкіх цэнтраў. У адным зь іх мы сьвяткуем сёньня наш сямідзясяты юбілей.

Паколькі бальшыня нашых першых іміграньтаў, беларускіх канадыйцаў, адыйшлі ўжо ў лепшы сьвет, хацела б папрасіць вас ушанаваць хвілінай маўчаньня іхную памяць.

Дзякую.

Хаця я ў гэтай залі, здаецца, найстарэйшая сяброўка ЗБК, прыехалі мы зь сям'ёю ў Канаду дваццаць гадоў пасьля першай хвалі беларускай эміграцыі. Але яшчэ ўсьпелі пазнаць бальшыню "старэйшых". Пісьменьніка Кастуся Акулу зь сям'ёй, Алеся і Олю Грыцукоў, доктара Барыса Рагулю (які ніколі не адмаўляў лячыць суродзічаў і фінансава памагаў царкве і Згуртаваньню), нашую дантыстку Раісу Жук-Грышкевіч (якая арганізавала ўсе культурныя імпрэзы ў гэтым цэнтры і была шмат разоў Старшынёй ЗБК), яе мужа Старшыню Рады БНР Вінцука Жук-Грышкевіча, Міколу і Марыю Ганько (якія прысьвячалі ўвесь свой вольны час беларускаму жыцьцю ў Таронта), Касьцюкевічаў, Целешаў, Антона Маркевіча, Міколу Шуста (якога вырабы з саломкі выстаўляліся на ўсіх беларускіх выстаўках і яшчэ вісяць на сьценах нашага цэнтру), цудоўную сям'ю Валентыны і Міхася Пашкевічаў, Арсеня Моніда, Барыса Кірку, ну і безумоўна Ўладыку Мікалая і шмат-шмат іншых.

Калі мы прыяжджалі з Атавы ў Таронта, каб памагчы нашым "тутэйшым" штосьці сарганізаваць – у 1972-м годзе былі ў Таронта 12 разоў – захапляліся ахвярнай працай і патрыятызмам нашых суродзічаў. З свайго боку, у Атаве, дзе мы былі доўгія гады адны, прадстаўлялі, як маглі, нашую грамаду на міжнароднай арэне. Актыўна праводзілі "палітыку прысутнасьці" ў грамадзкім жыцьці сталіцы, каб усе ведалі, што мы існуем.

Нашая грамада мела вялікае шчасьце, калі пачалі прыяжджаць у дзевяностыя гады эмігранты зь Беларусі. Да нас прыехалі, мусіць, самыя лепшыя, бо з самага пачатку ўключыліся ў беларускае жыцьцё і перанялі ад старэйшых царкоўныя і грамадзкія абавязкі.

Я была захопленая на апошўняй Сустрэчы Беларусаў Паўночнай Амэрыкі ў Нью-Ёрку відэам нашай Старшыні Алены Лявончанкі, дзе яна расказвала пра ўсё, што вы апошнім часам зрабілі. Таксама ўжо некалькі разоў глядзела з захапленьнем фільм "Яваровых людзей", "То-то-то".

Усім вам хочу выказаць маю ўдзячнасьць ня толькі як Старшыня Рады БНР, але і як найстарэйшая сяброўка ЗБК, якая тут прысутнічае.

Дык яшчэ раз віншую ўсіх вас зь юбілеем, жадаю цудоўнага сьвяткаваньне і шмат гадоў плённае працы, пакуль мы ўсе разам не адродзім вольную і дэмакратычную нашую дзяржаву.

Жыве Беларусь!

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

КАНЦЫЛЯРЫЯ СТАРШЫНІ

23 лістапада 2018 г.

**Зварот**
**Дзень герояў: віншаваньне Старшыні Рады БНР**

Дарагія Суродзічы!

Надыходзяць угодкі Слуцкага Збройнага Чыну і, як заўсёды, напаўняецца сэрца адначасна захапленьнем геразмам Случчакоў, якія "ішлі паміраць, каб жыла Бацькаўшчына", і сумам, што іх ахвярнасьць была дарэмнай. Было іх замала, каб стрымаць чужую навалу, ня было адпаведнай зброі й ніхто ім не памог у іх змаганьні.

Але Случчакі назаўсёды застануцца ў нашай памяці. Яны ішлі змагацца зь верай у сваю праўду, не таму што нехта ім загадаў ісьці, а таму што яны ведалі, што няма большай каштоўнасьці ў чалавека за волю – сваю і свайго народу.

Дзевяноста восем гадоў таму яны былі гатовыя аддаць жыцьцё за волю!

За гэтых 98 гадоў шмат што зьмянілася на нашай зямлі. Чужакі зьнішчылі мільёны найлепшых сыноў і дачок Беларусі. Тыя, што засталіся, разьвілі неверагодны інстынкт выжываньня, які дазволіў ім выжыць дасюль.

І дзякаваць Богу за гэта! Але ці за гэта змагаліся Случчакі?

Барацьба за вольную і дэмакратычную Беларусь, якую яны вялі, працягваецца і па сёньня.

Сёлетні год – юбілейны для беларускай дзяржаўнасьці. Але мы бачым, як на фоне суседніх з намі краінаў, што таксама сьвяткуюць стагодзьдзе сваёй незалежнасьці, рэжым у Беларусі фактычна праігнараваў гэтую найважнейшую дату. Адначасова з гэтым для ўсіх відавочнай стала ўсё большая небясьпека, якую прадстаўляе агрэсіўная пуцінская Расея. Рада БНР папярэджвала пра гэтую небясьпеку шмат гадоў. Але ня ўсе хочуць яе чуць. Маскоўскае прамываньне мазгоў выконвае сваю зларадную працу

Хочу папрасіць кожнага з вас, дарагія Суродзічы, каб прыпомнілі сёньня геразм нашых яшчэ недалёкіх продкаў і выказалі ім з глыбіні сэрца ўдзячнасьць беларускага народу за іх яскравы чын. Яны паказалі ўсім нам, як трэба цаніць сваю зямлю!

Жыве Беларусь!

**Івонка Сурвілла**
**Старшыня Рады БНР**

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

КАНЦЫЛЯРЫЯ СТАРШЫНІ

24 сьнежня 2018 г.

## Віншаваньне з Калядамі і Новым Годам

Дарагія суродзічы, дарагія беларусы ва ўсім сьвеце!

Надыходзіць канец 2018 году. Гэта быў асаблівы для нашага народу год: сёлета мы адсьвяткавалі соты юбілей адноўленае беларускае дзяржаўнасьці.

То былі цяжкія сто гадоў, поўныя гераічнага змаганьня, поўныя ахвяраў і стратаў. Але нікому так і не атрымалася нас скарыць. Бо нават бальшавікі былі вымушаныя аформіць сваю акупацыю Беларусі ў выглядзе вонкава незалежнай "савецкай рэспублікі", добра разумеючы, што волю беларускага народу да незалежнасьці ім ужо не зламаць.

З нагоды сёлетняга слаўнага юбілею я падпісала дэкрэт аб узнагароджаньні некалькіх дзясяткаў заслужаных асобаў у Беларусі і ў замежжы адмысловым юбілейным мэдалём Рады БНР. У самым хуткім часе мы паведамім пра гэта больш падрабязна.

Дарагія суайчыньнікі! Я хачу, каб мы з аптымізмам глядзелі у будучыню.

Цяперашні час няпросты: на Беларусі пануе беззаконьне і аўтарытарызм, а з-за мяжы нашай краіне пагражае агрэсіўная пуцінская Расея.

Азіраючыся на змагарныя апошнія сто гадоў мы бачым, што народу нашаму атрымалася пераадолець найцяжэйшыя выпрабаваньні: войны, акупацыі, тэрор, Чарнобыльскую катастрофу. Але стагодзьдзе ад абвешчаньня сваёй незалежнасьці Беларусь сустрэла ў якасьці ўсімі прызнанай паўнапраўнай самастойнай дзяржавы, што ёсьць нашай сапраўднай перамогай.

Беларускі народ, нягледзячы на дыктатуру і русыфікацыю, жыве! Тысячы актывістаў і неабыякавых людзей удзельнічаюць у шматлікіх беларускіх культурніцкіх і гістарычных праектах, будуюць помнікі, выдаюць кнігі, перакладаюць на беларускую мову творы сусьветнай літаратуры і кінэматографа, абараняюць Курапаты.

Усё гэта дае мне перакананьне, што мы перажывем і цяперашні час, захаваўшы ўласную мову, культуру і нацыянальную годнасьць.

“Магутны й сьмелы наш беларускі вольны дух” надалей жыве ў сэрцах тысячаў і тысячаў людзей.

Сардэчна віншую вас з Новым годам і сьвятам Божага нараджэньня!

Жыве Беларусь!

**Івонка Сурвілла**
**Старшыня Рады БНР**

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

16 студзеня 2019 г.

**Заява**
**Дэмакратызацыя – адзіная гарантыя незалежнасьці Беларусі**

У апошнія тыдні актывізавалася грамадзкая дыскусія вакол пагрозаў незалежнасьці Беларусі з боку Расейскае Фэдэрацыі. Зважаючы на аналіз сытуацыі, а таксама:

– Канстатуючы, што ў нацыянальных інтарэсах Беларусі – рэформа эканамічнай мадэлі краіны і выхад з усіх інтэграцыйных аб’яднаньняў з Расеяй, а ў доўгатэрміновай пэрспэктыве – будаўніцтва з будучай дэмакратычнай Расеяй раўнапраўных, рынкавых, добрасуседзкіх адносінаў, заснаваных на ўзаемнай павазе;

– Улічваючы, што саюзная дамова зь цяперашняй Расеяй не адлюстроўвае волю беларускага народу, які жадае добрых і шчыльных адносінаў з усімі сваімі суседзямі, у тым ліку з Украінай і краінамі Эўрапейскага Зьвязу;

– Улічваючы, што ўлады Рэспублікі Беларусь не паведамляюць грамадзтву пра канкрэтныя зьмест і вынікі перамоваў паміж А. Лукашэнкам і Ў. Пуцінам у канцы 2018 году, што стварае глебу для спэкуляцыяў і спрыяе росту напружанасьці, а таксама ўлічваючы, што цягам апошняга месяцу маюць месца спробы маніпуляваньня публічнай дыскусіяй з боку дэструктыўных палітычных сілаў у Расеі і ў Беларусі, да якіх беларускае грамадзтва павінна ставіцца разважана і акуратна;

Рада Беларускае Народнае Рэспублікі заклікае:

– Палітычна актыўных грамадзянаў і дэмакратычныя сілы – плянаваць свае дзеяньні на выпадак абвастрэньня пагрозы незалежнасьці Беларусі. Пры гэтым павінны заставацца ў сіле мэты дэмакратызацыі палітычнага жыцьця і дасягненьня паўнапраўнага статусу беларускае мовы й культуры, забясьпечыць якія павінны ўлады Рэспублікі Беларусь;

– Беларускую дыяспару ў дэмакратычных краінах – рыхтавацца да актыўнае асьветніцкае працы ў краінах свайго пражываньня па тэме незаконнасьці гіпатэтычнай анэксіі Беларусі з боку Расеі і недапушчальнасьці прызнаньня або ігнараваньня гэткае анэксіі міжнароднай супольнасьцю;

– Улады Рэспублікі Беларусь – дэмакратызаваць палітычную сыстэму краіны, а таксама правесьці парлямэнцкія і прэзыдэнцкія выбары, заплянаваныя на 2019 і 2020 гады, у поўнай адпаведнасьці зь міжнароднымі дэмакратычнымі стандартамі. Рада БНР заяўляе, што ўладам Рэспублікі Беларусь неабходна спыніць канфрантацыю і перасьлед патрыётаў Беларусі з шэрагаў дэмакратычнай апазыцыі, зрабіць захады дзеля кампрамісу сярод палітычных сілаў Беларусі ў інтарэсах безумоўнай грамадзкай кансалідацыі вакол каштоўнасьцяў незалежнасьці Беларусі.

Рада БНР зьвяртае ўвагу на тое, што юрыдычная сіла дакумэнтаў аб стварэньні так званае “саюзнае дзяржавы”, падпісаных раней ці маючых быць падпісанымі ў будучыні, павінна быць пастаўленая пад сумнеў, калі іхным падпісантам зь беларускага боку выступае асоба, якая займае пасаду прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь не па выніках дэмакратычных выбараў.

Рада БНР заяўляе, што дэмакратычныя выбары, павага да правоў чалавека і свабода слова – гэта адзіны магчымы шлях да нацыянальнай кансалідацыі беларусаў і да выхаду зь міжнароднай ізаляцыі, у якой Беларусь знаходзіцца апошнія дзесяцігодзьдзі.

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

18 лютага 2019 г.

**Заява**
**Салідарнасьць з "Хартыяй'97"**

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі выказвае сваю падтрымку і салідарнасьць з "Хартыяй'97" у сувязі з пагрозай спыненьня фінансаваньня гэтага СМІ.

"Хартыя'97" – адно з самых старых і найбольш папулярных незалежных беларускіх інтэрнэт-выданьняў. На працягу ўжо больш як 20 гадоў "Хартыя'97" пасьлядоўна і непахісна абараняе каштоўнасьці свабоды, дэмакратыі і незалежнасьці Беларусі.

Журналісты і рэдактары "Хартыі'97" неаднаразова былі аб'ектам палітычных рэпрэсіяў з боку ўладаў Рэспублікі Беларусь. Заснавальнік і рэдактар Алег Бябенін быў забіты пры дагэтуль ня высьветленых абставінах напярэдадні сумнавядомых прэзыдэнцкіх выбараў 2010 году.

Рада БНР заклікае польскую дзяржаву ў поўным аб'ёме працягнуць фінансаваньне "Хартыі'97" і іншых беларускіх незалежных СМІ, якія ў цяперашні час граюць надзвычайна важную ролю ў справе дэмакратычнай трансфармацыі Беларусі.

Рада БНР заклікае беларускую грамаду ў Польшчы зьвярнуцца да польскіх уладаў і патлумачыць важнасьць "Хартыі'97" і падтрымкі гэтага выданьня.

Рада БНР заклікае беларусаў ва ўсім сьвеце аказаць матар'яльную і маральную падтрымку "Хартыі'97".

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

КАНЦЫЛЯРЫЯ СТАРШЫНІ

21 сакавіка 2019 г.

**Віншаваньне з Днём Волі ад Старшыні Рады БНР**

Дарагія мае суродзічы-беларусы!

У гэты першы Дзень Волі другога стагодзьдзя нашай Рэспублікі хочу падзяліцца з вамі маім захапленьнем: нягледзячы на ўсе зьдзекі, на фізычнае нішчэньне найлепшых сыноў і дачок нашага народу, на прапаганду, якая прадаўжаецца да сёньня; нягледзячы на стараньне ворагаў, каб сьцерці наш край з паверхні Зямлі – мы выжылі!

Беларусь – жыве!

Другое стагодзьдзе нашай сучаснай дзяржавы пачалося, нажаль, узмоцненай прапагандысцкай атакай супраць яе. Але за апошнюю чверць стагодзьдзя беларусы навучыліся разважаць іншымі катэгорыямі і ведаюць розьніцу між воляй і рабствам. Многія беларусы, перадусім з маладога пакаленьня, на свае вочы пабачылі, як заможна жывуць нават маленькія дзяржавы, якія не заўсёды маюць прыродныя багацтвы, але якія маюць таленавітае і працавітае грамадзтва, якое супольна працуе на дабрабыт свайго народу.

Беларускай моладзі ня трэба даказваць, што супольнасьць пасьпяховых, адукаваных і вольных грамадзянаў – гэта самы важны рэсурс краіны. Спатканьні мае з маладымі беларусамі напаўняюць сэрца радасьцю: гэта золата, якое мы павінны цаніць.

Дык зьвяртаюся сёньня перад усім да Вас, мае дарагія маладыя сябры! Бо Вы здольныя выратаваць наш край ад новай няволі. Вы разумееце пачуцьцё годнасьці вольнага чалавека. Вы ведаеце, хто Вы!

Віншую ўсіх Вас, мае дарагія суродзічы, асабіста і ад імя Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, з новым, другім стагодзьдзем ад абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі і жадаю, каб змаганьне за волю было плённым і пераможным!

Жыве Беларусь!

**Івонка Сурвілла,**
**Старшыня Рады БНР**

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

4 красавіка 2019 г.

## Заява
## Курапаты – сьвятое для беларусаў месца

Рада БНР выказвае сваё асуджэньне і сум з нагоды зьнішчэньня крыжоў ва ўрочышчы Курапаты.

Курапаты – месца, дзе савецкі таталітарны рэжым зьнішчыў дзясяткі тысячаў бязьвінных людзей. Гэта галоўны беларускі нацыянальны мэмарыял ахвяраў савецкага тэрору, аналягічны таму, як Хатынь – знакавае месца памяці ахвяраў нацыстоўскага тэрору супраць мірнага беларускага насельніцтва, а Трасьцянец і мэмарыял “Яма” ў Менску – месцы ўшанаваньня памяці соцень тысячаў беларускіх габрэяў, забітых у час Галакоста.

Адначасова Курапаты – гэта месца, якое з канца 80-х гадоў увасабляе адраджэньне беларускага народу зь нябыту. Адметнасьць і сымбалічнасьць гэтага мэмарыялу ў тым, што ён падтрымліваецца выключна сіламі беларускае грамадзянскае супольнасьці, без удзелу афіцыйных уладаў, а часьцяком і насуперак іхнаму ціску або злачыннаму бязьдзеяньню. Менавіта такім народным мэмарыялам Курапаты маюць быць у будучай дэмакратычнай Беларусі.

Рада БНР асуджае спробы ўладаў зьмяніць склаўшуюся натуру і характар мэмарыяла Курапаты і заклікае беларусаў усяляк падтрымаць актывістаў, якія стаяць на абароне гэтага сьвятога для ўсіх нас месца.

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

27 чэрвеня 2019 г.

**Заява**
**на трыццацігодзьдзе Беларускага народнага фронту**
**і Таварыства беларускай мовы**

У гэтыя дні спаўняецца трыццаць гадоў ад заснаваньня Беларускага народнага фронту і Таварыства беларускае мовы імя Францішка Скарыны.

Абедзьве гэтыя арганізацыі сталіся яскравымі гістарычнымі зьявамі, адыграўшы значную ролю ў аднаўленьні незалежнасьці Беларусі і ў абароне беларушчыны ў вельмі неспрыяльныя часы.

Беларускі народны фронт – агульнанацыянальны дэмакратычны беларускі рух, які ў позьнесавецкі час стаўся выразьнікам волі беларускага народу да свабоды, дэмакратыі і незалежнасьці, абаронцам чалавечай і нацыянальнай годнасьці беларусаў. Уголас агучыўшы праўду пра Курапаты і Чарнобыльскую катастрофу, БНФ паставіў пытаньне пра аднаўленьне справядлівасьці і належную ацэнку палітыцы савецкага рэжыму да беларусаў.

Дэпутаты БНФ у Вярхоўным савеце Беларусі ў лёсавызначальны для нашай краіны час сталі рухавіком дэмакратычных пераўтварэньняў і ўрэшце аднаўленьня незалежнасьці Беларусі пасьля дзесяцігодзьдзяў іншаземнай акупацыі. Дзякуючы Беларускаму народнаму фронту, Беларусь вось ужо амаль трыццаць гадоў ёсьць паўнапраўнай сувэрэннай дзяржавай, што заняла “свой пачэсны пасад між народамі”.

Многія яскравыя і адважныя палітыкі сучаснай Беларусі, што цяпер прадстаўляюць розныя дэмакратычныя сілы, пачыналі свой шлях у Беларускім народным фронце.

Таварыства беларускай мовы – адна з галоўных арганізацыяў, што рупяцца пра прасоўваньне беларускае мовы і абарону правоў яе носьбітаў у сучаснай Беларусі. Ва ўмовах абыякавасьці ці нават варожасьці афіцыйных постсавецкіх уладаў у адносінах да роднае мовы беларускага народу, абарона мовы і моўных правоў сталася задачай простых людзей, шырокае грамадзянскае супольнасьці. ТБМ імя Ф. Скарыны ёсьць авангардам гэтага руху і шматгадовым сымбалем таго, як грамадзянская супольнасьць самастойна бароніць беларускую мову.

Беларускі народны фронт і Таварыства беларускае мовы – гэта выбітныя і пасьпяховыя прыклады грамадзянскай самаарганізацыі беларусаў, абароны самім народам сваіх правоў перад апаратам недобрасумленнай аўтарытарнай улады.

Рада БНР шчыра віншуе ўсіх цяперашніх і былых удзельнікаў БНФ і ТБМ. Няхай гэтыя арганізацыі будуць прыкладам і натхненьнем для многіх пакаленьняў беларускіх грамадзянаў.

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

23 жніўня 2019 г.

**Заява**
**да 80-х угодкаў Пакта Молатава-Рыбэнтропа**

У гэты дзень 80 гадоў таму Савецкі Саюз і гітлераўская Нямеччына падпісалі пагадненьне аб ненападзе, сакрэтная частка якога прадугледжвала падзел Усходняй Эўропы паміж гэтымі дзьвюма таталітарнымі дзяржавамі. Заходняя Беларусь, якая ў той час знаходзілася пад польскім кантролем, апынулася ў сфэры ўплыву СССР, які на той момант ужо кантраляваў усходнюю частку Беларусі.

Праз тыдзень пасьля падпісаньня пагадненьня Нямеччына напала на Польшчу, што сталася пачаткам Другой сусьветнай вайны.

Двума тыднямі пазьней да Гітлера далучыўся Савецкі Саюз, напаўшы на Польшчу з усходу і дэ-факта ўступіўшы ў Другую сусьветную вайну на баку нацыстоўскай Нямеччыны. У 1939-1941 годзе СССР захапіў Заходнюю Беларусь, Заходнюю Ўкраіну, Бэсарабію і краіны Балтыі. Толькі Фінляндыя здолела абараніць сваю незалежнасьць у няроўнай вайне супраць савецкай ваеннай машыны.

Вайна паміж Нямеччынай і СССР пачалася летам 1941 года, праз амаль два гады пасьля пачатку Другой сусьветнай вайны. Цягам трох гадоў Беларусь была акупаваная нямецкімі войскамі. Нямецкая акупацыя суправаджалася генацыдам беларускага габрэйства, палітычным тэрорам, злачынствамі супраць мірнага насельніцтва.

Пакт Молатава-Рыбэнтропа сымбалізуе трагедыю нашага рэгіёна ў дваццатым стагодзьдзі. Мільёны ўсходнеэўрапейцаў былі зьнішчаныя нацыстамі і камуністамі за свае палітычныя погляды, этнічнае ці сацыяльнае паходжаньне. Мільёны загінулі ў Другой сусьветнай вайне, адказнасьць за разьвязаньне якой нясуць таталітарныя рэжымы ў Нямеччыне і СССР.

Апынуўшыся пад савецкай і нацыстоўскай акупацыямі, Беларусь і іншыя краіны рэгіёну згубілі дзесяцігодзьдзі свабоднага разьвіцьця.

Беларусь пацярпела ад нацыстоўскай і савецкай акупацыяў больш, чым многія іншыя краіны. Мы дагэтуль не пераадолелі наступстваў дзесяцігодзьдзяў рэпрэсій і прапаганды, якія сфармавалі некалькі пакаленьняў людзей.

Савецкую інэрцыю ў Беларусі ўвасабляе аўтарытарны і карумпаваны рэжым Аляксандра Лукашэнкі, чые ідэалёгія і мэтады кіраваньня перадусім абапіраюцца на спадчыну савецкага рэжыму. На раньнім этапе свайго прэзыдэнцтва А. Лукашэнка публічна выказваў захапленьне сыстэмай улады, пабудаванай Адольфам Гітлерам у Нямеччыне. Наступныя гады пасьля гэтай скандальнай заявы пацьвердзілі шчырасьць гэтага захапленьня.

Разам з тым, угодкі Пакта Молатава-Рыбэнтропа сталі імпульсам для нашых суседзяў, каб дамагчыся аднаўленьня свае незалежнасьці ад СССР. У гэтыя дні краіны Балтыі адзначаюць трыццатыя ўгодкі “Балтыйскага шляху” – беспрэцэдэнтнай мірнай акцыі пратэсту, якая ў 1989 годзе абʼяднала некалькі мільёнаў жыхароў савецкай Прыбалтыкі ў патрабаваньні свабоды для сваіх краінаў. Грамадзкі чын у Латвіі, Літоўскай Рэспубліцы і Эстоніі стаў моцным натхненьнем і для беларусаў.

Нягледзячы на тэрор і прапаганду, нашыя народы здолелі выжыць і адрадзіць сваю незалежнасьць у канцы дваццатага стагодзьдзя. У гэтым ёсьць вялікая гістарычная перамога ў тым ліку і беларускага народу.

Рада БНР пацьвярджае сваю ацэнку нацыстоўскаму рэжыму ў Нямеччыне і камуністычнаму рэжыму ў СССР, дадзеную ў Заяве да 70-годзьдзя ад

заканчэньня Другой сусьветнай вайны (2015), Дэклярацыі памяці і салідарнасьці (2016) і іншых дакумэнтах.

Рада БНР рашуча асуджае негалосную рэгабілітацыю сталінізма, якая ў апошнія гады адбываецца ў Расеі і пад яе ўплывам – у Беларусі. Рада БНР зьвяртае ўвагу на неабходнасьць юрыдычнай і гістарычнай ацэнкі дзеяньняў савецкага рэжыму ў Беларусі па аналёгіі з існуючай ацэнкай злачынстваў нацыстоўскага рэжыму.

Рада БНР заяўляе, што будучыня Беларусі павінна будавацца згодна з каштоўнасьцямі свабоды і дэмакратыі, зь неаспрэчным прыярытэтам правоў асобы і каштоўнасьці жыцьця чалавека.

Рада БНР зьвяртае ўвагу на выключную важнасьць міжнароднай салідарнасьці і рашучага міжнароднага адпору дыктатарскім рэжымам на грунце каштоўнасьцяў свабоды і дэмакратыі – як у час Другой сусьветнай вайны, так і ў цяперашні час. Няхай вопыт дваццатага стагодзьдзя будзе для чалавецтва надзейнай прышчэпкай супраць таталітарызму.

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

16 верасьня 2019 г.

**Заява**
**Саюзная дзяржава з Расеяй супярэчыць інтарэсам беларускага народу**

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі выказвае занепакоенасьць перамовамі паміж аўтарытарнымі рэжымамі ў Расеі і Беларусі адносна паглыбленьня ўзаемнай інтэграцыі ў рамках так званай “Саюзнай дзяржавы”. Перамовы традыцыйна праходзяць у непразрыстым для грамадзкасьці фармаце і нясуць прамую пагрозу сувэрэнітэту і нацыянальнай бясьпецы Беларусі.

Для аўтарытарнага рэжыму, які пануе ў Расеі, інтэграцыя зь Беларусьсю мае відавочную мэту падтрымаць сваю папулярнасьць з дапамогай нацыяналістычнай мабілізацыі і, магчыма, даць прэзыдэнту Ўладзіміру Пуціну юрыдычную магчымасьць застацца на чале дзяржавы пасьля 2024 году, калі сканчаецца ягоны цяперашні тэрмін паўнамоцтваў.

Прэзыдэнт Расеі Ў. Пуцін у сваіх публічных выказваньнях неаднаразова недвухсэнсоўна адмаўляў права беларускага народу на самастойнасьць і прыніжаў каштоўнасьць беларускае дзяржаўнасьці. Гэта зьяўляецца абразай беларускага народу, і перамовы аб разьвіцьці бліжэйшых сувязяў з Расеяй ня могуць весьціся, пакуль расейскі бок выступае зь непрыхавана шавіністычных і імпэрскіх пазыцыяў.

Рада БНР адзначае наступнае:

1. Інтэграцыя сам-насам паміж Беларусьсю і Расеяй ня можа насіць раўнапраўны характар у сілу розных памераў краінаў: насельніцтва, эканомікаў, вайсковага патэнцыялу. Разьвіцьцё так званай “Саюзнай дзяржавы” дэ-факта азначае інкарпарацыю Беларусі ў склад Расеі і абнуленьне незалежніцкіх дасягненьняў, якія здабыў беларускі народ за апошнія сто гадоў. Страта незалежнасьці Беларусі будзе азначаць

немагчымасьць для беларусаў самастойна кіраваць сваім жыцьцём, самастойна будаваць стасункі са сьветам, бо гэтым ад імя Беларусі будзе зноў займацца Масква.

2. Пасьля вайсковай агрэсіі супраць Украіны і незаконнай акупацыі і анэксіі часткі сувэрэннай тэрыторыі Ўкраіны Расея ідзе шляхам паглыбленьня сваёй міжнароднай ізаляцыі. Расейскі рэжым накладае абмежаваньні на ўласных грамадзянаў, абмяжоўвае гандаль, паступова ізалюе расейскі сэгмэнт інтэрнэта ад глябальнага сеціва. Інтэграцыя з гэткай краінай непазьбежна будзе азначаць распаўсюд на Беларусь як міжнародных санкцыяў супраць расейскага рэжыму, так і тых абмежавальных мераў, якія расейскі рэжым накладае на ўласных грамадзянаў.
3. Расея знаходзіцца ў эканамічным крызісе і далучэньне Беларусі распаўсюдзіць крызіс і на нашую краіну, абмежаваўшы магчымасьці Беларусі рэфармаваць уласную эканоміку, прыцягваць інвэстараў, наладжваць каапэрацыю з іншымі краінамі сьвету. Далучэньне да Расеі толькі пагоршыць эканамічнае становішча і дабрабыт беларусаў.
4. У Расеі пабудаваны аўтарытарны рэжым, які па шматлікіх парамэтрах зрабіўся больш жорсткім, чым рэжым А. Лукашэнкі ў Беларусі. У цяперашняй Расеі адсутнічаюць свабодныя выбары і свабода слова, адбываюцца рэпрэсіі супраць грамадзянскай супольнасьці, незалежных журналістаў і іншадумцаў. Забойствы палітычных апанэнтаў, якія перасталі быць штодзённасьцю ў Беларусі, сталіся штодзённасьцю ў пуцінскай Расеі.
5. Далучэньне да Расеі будзе азначаць для беларусаў пэрспэктыву ваяваць за інтарэсы тамтэйшага карумпаванага нацыяналістычнага рэжыма у рамках незаконных вайсковых апэрацый у аддаленых рэгіёнах – Абхазіі, Паўднёвай Асэтыі, Данбасе і Сырыі, ня кажучы пра ўдзел у новай гонцы ўзбраеньняў, новым безнадзейным для Расеі супрацьстаяньні з усім астатнім сьветам.
6. Беларускі народ жадае мець добрыя стасункі з усімі сваімі суседзямі, у тым ліку з Украінай, Польшчай, краінамі Балтыі, іншымі краінамі Эўрапейскага Зьвязу, Злучанымі Штатамі Амэрыкі. Беларусы хочуць, каб Беларусь была заможнай эўрапейскай краінай, дзе ўсім гарантаваныя дэмакратычныя правы. Анэксія Беларусі з боку аўтарытарнай і беднай пуцінскай Расеі паставіла б крыж на гэтых мэтах.

Рада БНР рашуча адмаўляе любыя абвінавачваньні беларускага дэмакратычнага руху ў так званай “русафобіі”, якія гучаць з боку расейскай нацыяналістычнай прапаганды. Мы шануем расейскую культуру і расейскі народ. Мы жадаем расейскаму народу дабра і вызваленьня ад агрэсіўнага

аўтарытарнага рэжыму, які наносіць гіганцкую шкоду ў тым ліку і сваёй уласнай краіне. Як і ўвесь беларускі народ, мы выступаем за ўзаемапаважныя добрасуседзкія стасункі паміж дэмакратычнай Беларусьсю і дэмакратычнай Расеяй.

Рада БНР пацьвярджае свае прапановы, агучаныя ў заяве ад 16 студзеня 2019 году, і заклікае:

- Палітычна актыўных грамадзянаў і дэмакратычныя сілы – плянаваць свае дзеяньні на выпадак абвастрэньня пагрозы незалежнасьці Беларусі. Пры гэтым павінны заставацца ў сіле мэты дэмакратызацыі палітычнага жыцьця і дасягненьня паўнапраўнага статусу беларускае мовы й культуры, забясьпечыць якія павінны ўлады Рэспублікі Беларусь;

- Беларускую дыяспару ў дэмакратычных краінах – зьвяртацца да ўрадаў краін свайго пражываньня па тэме небясьпекі анэксіі Беларусі з боку Расеі, яе заведамай незаконнасьці, а таксама недапушчальнасьці прызнаньня або ігнараваньня гэткае анэксіі міжнароднай супольнасьцю;

- Улады Рэспублікі Беларусь – дэмакратызаваць палітычную сыстэму краіны, а таксама правесьці парлямэнцкія і прэзыдэнцкія выбары, заплянаваныя на 2019 і 2020 гады, у поўнай адпаведнасьці зь міжнароднымі дэмакратычнымі стандартамі. Рада БНР заяўляе, што ўладам Рэспублікі Беларусь неабходна спыніць канфрантацыю і перасьлед патрыётаў Беларусі з шэрагаў дэмакратычнай апазыцыі, зрабіць захады дзеля кампрамісу сярод палітычных сілаў Беларусі ў інтарэсах безумоўнай грамадзкай кансалідацыі вакол каштоўнасьцяў незалежнасьці Беларусі.

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

17 верасьня 2019 г.

**Заява**
**да 80-х угодкаў далучэньня Заходняй Беларусі да СССР**

У гэты дзень 80 гадоў таму, праз два з паловай тыдні пасьля нападу гітлераўскай Нямеччыны на Польшчу і пачатку Другой Сусьветнай вайны, савецкія войскі перайшлі мяжу з Польшчай і пачалі свой наступ на Захад насустрач нямецкім войскам. За два тыдні саветы акупавалі значную тэрыторыю. 28 верасьня СССР і гітлераўская Нямеччына падпісалі Дамову аб сяброўстве і мяжы, у якой зафіксавалі падзел тэрыторыі рэгіёна пасьля сумеснай расправы над польскай дзяржавай.

У выніку гэтых падзеяў амаль уся тэрыторыя Беларусі апынулася ў складзе таталітарнай савецкай дзяржавы. Гэты факт дазваляў савецкай прапагандзе сьвяткаваць 17 верасьня як “Дзень узьяднаньня” Заходняй Беларусі з БССР.

Рада БНР канстатуе, што падзел тэрыторыі Беларускай Народнай Рэспублікі, вырашаны паміж РСФСР і Польшчай у 1921 годзе, адбыўся насуперак волі беларускага народу і ў парушэньне права беларускага народу на самавызначэньне.

Рада БНР канстатуе, што аўтарытарны рэжым у міжваеннай Польшчы груба парушаў нацыянальныя правы беларусаў і ажыцьцяўляў дыскрымінацыю беларусаў па нацыянальнай прыкмеце, адмаўляючы беларусам у праве на аўтаномію, абмяжуючы магчымасьці для беларускай адукацыі і грамадзка-палітычнай дзейнасьці, чынячы палітычны перасьлед беларускіх грамадзкіх дзеячоў. Сваімі дзеяньнямі польскія ўлады парушалі як свае агульнапрызнаныя міжнародныя абавязальніцтвы, так і дамоўленасьці зь беларускімі нацыянальнымі арганізацыямі, дасягнутыя ў пачатку дваццатых гадоў.

Разам з тым, Рада БНР адзначае, што дыскрымінацыя беларусаў у СССР мела нашмат больш жорсткі характар, чым у Польшчы. Ва ўмовах савецкага таталітарнага рэжыму беларусы ня мелі магчымасьці адкрыта выказваць нязгоду з уладамі, фармаваць альтэрнатыўныя камуністычнай партыі палітычныя рухі, карыстацца свабодай слова. Дзясяткі тысячаў беларусаў у дваццатыя і трыццатыя гады мінулага стагодзьдзя сталі ахвярамі палітычнага тэрору і дэпартацый. Усходнебеларускай культурніцкай і грамадзкай эліце быў нанесены непапраўны ўдар у час сталінскіх рэпрэсій, калі савецкай уладай былі забітыя сотні выбітных беларускіх інтэлектуалаў і дзеячоў культуры.

Рада БНР заяўляе, што далучэньне Заходняй Беларусі да СССР аб'яднала большую частку этнаграфічнай Беларусі пад уладай зьнешняй дзяржавы, якая акупавала Беларусь насуперак волі беларускага народа і зьдзяйсьняла палітыку, варожую ў адносінах да беларусаў і да Беларусі як незалежнай дзяржавы. Савецкая агрэсія супраць Польшчы мела на мэце не ўзьяднаньне беларускага народу, а захоп новых тэрыторыяў, распаўсюд камуністычнае дыктатуры на заходнюю частку этнаграфічнае Беларусі і ў тым ліку зьнішчэньне альтэрнатыўных несавецкіх цэнтраў беларускага грамадзка-палітычнага жыцьця, што існавалі ў Заходняй Беларусі, нягледзячы на ціск польскіх уладаў.

Рада БНР адзначае, што пасьля анэксіі Заходняй Беларусі сталінскі рэжым у палітычных мэтах, з паказальным ігнараваньнем нават фальшывага ранейшага "волевыяўленьня" заходніх беларусаў аб далучэнні да СССР, перадаў тэрыторыі зь беларускім насельніцтвам і гарадамі Вільняй, Беластокам і іншымі ў склад суседніх дзяржаваў.

Рада БНР адзначае, што за анэксіяй Заходняй Беларусі пасьледвала хваля тэрору супраць заходнебеларускіх палітычных актывістаў, у тым ліку тых, хто раней вітаў далучэньне Заходняй Беларусі да СССР, а таксама супраць шырокіх катэгорыяў грамадзянаў паводле сацыяльных і эканамічных прыкметаў.

Рада БНР паўторна выказвае сваё асуджэньне таталітарных рэжымаў дваццатага стагодзьдзя, выказанае ў Заяве да 80-годзьдзя Пакту Молатава-Рыбэнтропа (23.08.2019) і іншых дакумэнтах Рады.

Рада БНР заяўляе пра неабходнасьць прымірэньня па гістарычных пытаньнях і выпрацоўкі супольнага бачаньня гісторыі дваццатага стагодзьдзя, у тым ліку яе неадназначных старонак, як далучэньне Заходняй Беларусі да СССР, паміж Беларусьсю, Польшчай, Расеяй і іншымі краінамі нашага рэгіёна.

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

КАНЦЫЛЯРЫЯ СТАРШЫНІ

21 лістапада 2019 г.

## Зварот Старшыні Рады БНР да дня Слуцкага збройнага чыну – 2019

Дарагія суродзічы-беларусы!

Як і кожны год у гэты восеньскі месяц, беларусы з удзячнасьцю прыпамінаюць і аддаюць чэсьць сваім слаўным случчаком, якія пайшлі змагацца пад бел-чырвона-белым сьцягам за сваю зямельку. Пайшлі ўміраць каб жыла Беларусь!

У гэтым годзе – таксама ў лістападзе – адбудзецца ў Вільні перапахаваньне Кастуся Каліноўскага і іншых герояў Паўстаньня 1863-1864 г. ў Беларусі. Дасюль ляжалі іх замардаваныя парэшткі ў агульнай непазначанай яме на Замкавай гары.

З нагоды перапахаваньня адбудзецца ў Вільні вялікая ўрачыстасьць 22-га лістапада. Дарагія суродзічы, прашу ўсіх вас далучыцца думкамі да гэтае падзеі. Прыпамінаю, што пароль паўстанцаў быў:

“Каго любіш? Люблю Беларусь! Так узаемна!”

А вось што пісаў нам з-пад шыбеньніцы засуджаны царскімі ўладамі на сьмерць, наш герой. Сёньня як ніколі хачу, каб вы пачулі ягоныя словы любові да сваей Бацькаўшчыны і свайго народу:

“Браты мае, мужыкі родныя. З-пад шыбеньніцы маскоўскай прыходзіць мне да Вас пісаці, і можа раз астатні! Горка пакінуць зямельку родную і Цябе, дарагі мой народзе. Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, но не жаль згінуць за Тваю праўду. Прыймі народзе маё слова прадсьмертнае, бо яно, як з таго сьвета, толькі для дабра Твайго напісана!”

І канчае Яська, гаспадар з-пад Вільні, свой ліст усім нам ведамымі словамі: “Бо я Табе з-пад шыбеніцы кажу Народзе, што тады толькі зажывеш шчасьліва, калі над Табою Маскаля ўжо ня будзе!”

Словы гэтыя актуальныя па сёньня! Хаця дзяржава наша незалежная, кіруюць ёю яшчэ ўсё ворагі нашай свабоды. Дык памятайма “слова прадсьмертнае” нашага героя, дарагія суродзічы, бо “толькі для дабра нашага яно напісана”!

Жыве Беларусь!

**Івонка Сурвілла,**
**Старшыня Рады БНР**

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

КАНЦЫЛЯРЫЯ СТАРШЫНІ

22 лістапада 2019 г.

**Зварот Старшыні Рады БНР**
**з нагоды ўрачыстага пахаваньня герояў Паўстаньня 1863-1864 гг.**

Шаноўныя суродзічы-беларусы,

Дарагія нашыя польскія і літоўскія суседзі і сябры.

Сёньня мы сьведкі вялікай гістарычнай падзеі. Нарэшце героі нашых трох народаў, паўстанцы, якія аддалі сваё жыцьці за нашу і вашу свабоду, знойдуць свой спачын.

Кастусь Каліноўскі і ягоныя паплечнікі сталі натхняльнікамі беларускага нацыянальна-вызвольнага руху. Каліноўскі стаў сымбалем барацьбы беларускага народу за вольнасьць, за свае нацыянальныя і сацыяльныя правы. "Каго любіш? Люблю Беларусь" – гэты пароль выкарыстоўвалі паўстанцы Каліноўскага. Гэты пароль нібы даў штуршок да нараджэньня нашай сучаснай нацыі і застаецца нашым паролем, нашым дэвізам па сёньня.

Вялікі гонар для нас быць сьведкамі доўгачаканага ганаровага пахаваньня гэтых людзей. Вялікі гонар – пакланіцца ім і ўшанаваць іхную памяць.

Героі-паўстанцы яднаюць нашыя тры народы: беларускі, літоўскі, польскі. Многія зь іх нарадзіліся на тэрыторыі цяперашняй Беларусі. Усе яны былі патрыётамі нашай супольнай гістарычнай айчыны, старадаўняй Літвы. І

спачын яны знайшлі ў горадзе, які гэтаксама зьяўляецца сваім і для беларусаў, і для літоўцаў, і для палякаў: у Вільні.

Барацьба, якую вялі паўстанцы, праз 55 гадоў пасьля іхнае гераічнае сьмерці прывяла да абвяшчэньня незалежных Беларускай Народнай Рэспублікі, Літоўскай Рэспублікі і Польшчы.

Змаганьне Кастуся Каліноўскага і ягоных паплечнікаў служыць нам моцным прыкладам. Нават забіўшы цела, ворагі ня здолелі забіць дух нашай вызвольнай барацьбы. І празь дзесяцігодзьдзі нашыя народы перамаглі, бо кіравала імі прага да Волі і Свабоды.

Незалежнасьць Беларусі сёньня зноў пад пагрозай. Але зь верай у нашую праўду, якую так часта ўспамінае ў сваіх артыкулах Кастусь Каліноўскі, мы пераможам. Беларусь будзе вольнай дэмакратычнай краінай, як нашыя сяброўскія Польшча і Літоўская Рэспубліка, з кім мы разам у сёньняшні ўрачысты дзень.

Вечная памяць і слава нашым героям!

**Івонка Сурвілла**
**Старшыня Рады Беларускае Народнае Рэспублікі**

RADA OF THE BELARUSIAN DEMOCRATIC REPUBLIC

22 November 2019

**Address**
**On the occasion of the funeral of the heroes of the Uprising of 1863-1864**

My dear fellow Belarusians,

Our dear Polish and Lithuanian neighbours and friends,

Today we are witnessing a great historical event. Finally, the heroes of our three nations, the rebels who gave their lives for the freedom of all of us, will find their rest.

Kastuś Kalinoŭski and his comrades have become an inspiration for the Belarusian national liberation movement. Kalinoŭski became a symbol of the struggle of the Belarusian people for freedom, for national and social liberation. "Who do you love? I love Belarus" - this was the codeword of Kalinoŭski's insurgents. This motto has given an impulse that led to the birth of our modern nation. This phrase remains our codeword, our motto today.

It is a great honour to be the witnesses of the long-awaited honourable funeral of these people. A great honour to pay our respect to their memory.

These heroes unite our three nations: Belarusians, Lithuanians and Poles. Many of them were born on the territory of modern Belarus. They all were patriots of our common historical motherland, the ancient Lithuania. And they have found

their rest in a city where all of us – Belarusians, Lithuanians, and Poles alike – are at home: in Vilnius (Vilnia, Wilno).

55 years after their heroic death, the struggle of these insurgents has led to the creation of the independent Belarusian Democratic Republic, Lithuanian Republic and Poland.

The struggle of Kastuś Kalinoŭski and his comrades is a powerful example to us. Even having murdered these men, the enemies have not killed our will to fight for freedom. And decades later, our nations have won, because they were led by the desire to live free.

The independence of Belarus is again threatened today. But with the belief in our truth, which Kalinoŭski has many times mentioned in his articles, we will win. Belarus will be a free and democratic country, as are now our dear neighbours, the Lithuanian Republic and Poland, with whom we are glad to be together on this special day.

An eternal glory and eternal memory to our heroes!

**Ivonka Survilla**
**President of the Rada of the Belarusian Democratic Republic**

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

1 сьнежня 2019 г.

## Заява падпісантаў Віленскага мэмарандуму аб пагрозе незалежнасьці Беларусі

Сумесная заява падпісантаў Віленскага мэмарандуму (2012), прадстаўнікоў палітычных партыяў, рухаў, грамадзкіх арганізацыяў

Мы, падпісанты Віленскага мэмарандуму 2012 году, прадстаўнікі дэмакратычных партыяў, рухаў, грамадзянскай супольнасьці Беларусі сумесна з Радай Беларускай Народнай Рэспублікі:

— зьвяртаем увагу беларускага народу і міжнароднай супольнасьці на небясьпечны намер кіраўнікоў Расеі і Беларусі Ўладзіміра Пуціна і Аляксандра Лукашэнкі падпісаць 8 сьнежня сёлета дамовы, якія замацоўваюць залежнасьць Беларусі ад Расеі ды патэнцыйна пагражаюць самому далейшаму існаваньню Беларусі як незалежнай сувэрэннай дзяржавы;

— нагадваем, што беларускі народ стагодзьдзямі змагаўся за сваю незалежную дзяржаўнасьць, паклаўшы ў барацьбе спачатку з Расейскай, а затым з камуністычнай савецкай імпэрыяй незьлічоную колькасьць жыцьцяў, і гэтыя ахвяры не забытыя;

— падкрэсьліваем, што лёсавызначальныя для беларускага народу пагадненьні рыхтуюцца ў поўнай сакрэтнасьці, без якіх бы ні было кансультацыяў з прадстаўнікамі грамадзкасьці. Ніводзін праект дакумэнта не апублікаваны. Нават „дэпутаты парлямэнту“ ня здолелі атрымаць хаця б мінімальную інфармацыю ад ураду Беларусі;

— зазначаем, што ініцыятары інтэграцыі абгрунтоўваюць свае дзеяньні вынікамі праведзенага ў Беларусі ў 1995 годзе рэфэрэндуму, адным з пытаньняў якога была эканамічная інтэграцыя з Расеяй. Але рэфэрэндум быў прызначаны насуперак Канстытуцыі і заканадаўству, у тым ліку шляхам зьбіцьця збройнымі падразьдзяленьнямі спэцслужбаў дэпутатаў апазыцыі непасрэдна ў залі парлямэнту, ён праходзіў з шматлікімі фальсыфікацыямі і не зьяўляецца сапраўдным волевыяўленьнем беларускага народу;

— заяўляем, што ад моманту абраньня Лукашэнкі прэзыдэнтам у 1994 годзе, у Беларусі не было свабодных і справядлівых выбараў, а ў лістападзе 1996 адбыўся канстытуцыйны пераварот і парлямэнт быў гвалтоўна распушчаны. У часе апошняй выбарчай кампаніі ў "палату прадстаўнікоў" значная частка непраўладных кандыдатаў не была дапушчаная да рэгістрацыі, нідзе назіральнікі не былі дапушчаныя да падліку галасоў, на шмат якіх участках зафіксаваныя іншыя парушэньні. У "парлямэнт" не прапушчаны ніводзін непраўладны кандыдат. Такім чынам, у Беларусі няма легітымнай заканадаўчай улады, а значыць, любыя дамовы, падпісаныя цяперашняй уладай, апрыёры неканстытуцыйныя;

— нагадваем, што ў пачатку 1990-х гадоў Беларусь добраахвотна адмовілася ад ядзернай зброі, даверыўшыся гарантыям свайго сувэрэнітэту, сфармуляваным у так званым Будапэшцкім мэмарандуме, падпісаным ЗША, Вялікай Брытаніяй і Расеяй. Аднак абмежаваньне сувэрэнітэту Беларусі аж да пагрозы інкарпарацыі з боку Расеі, якая пад уладай Пуціна вядзе палітыку агрэсіўнай ваяўнічай імпэрыі, можа стварыць прынцыпова іншую і вельмі небясьпечную геапалітычную сытуацыю ў Эўропе: расейскае войска апынецца на 600 кілямэтраў бліжэй да эўрапейскіх сталіц.

Мы пацьвярджаем пазыцыю, заяўленую ў Віленскім мэмарандуме 2012 году: "Суб'ектам і першасным гарантам незалежнай дзяржаўнасьці Беларусі і нацыянальна-культурнай пэрспэктывы беларусаў ёсьць сам беларускі народ, які павінен сьцьвярджаць сваю палітычную волю ва ўмовах свабоды".

Мы падкрэсьліваем, што кансэрвацыя антыдэмакратычнай, не падсправаздачнай народу, пазбаўленай дэмакратычна-канстытуцыйнай легітымнасьці ўлады ў Беларусі толькі ўзмацняе пагрозу незалежнасьці краіны.

Мы заклікаем дэмакратычныя дзяржавы сьвету, у тым ліку тыя, што падпісвалі Будапэшцкі мэмарандум, а таксама Эўрапейскі Зьвяз асудзіць любыя спробы Расейскай Фэдэрацыі абмежаваць сувэрэнітэт Беларусі,

выкарыстоўваючы адсутнасьць у Беларусі дэмакратычна выбранай улады, а таксама выступіць з ініцыятывай гарантыяў незалежнасьці Беларусі на міжнародна-праўнай аснове.

**Алена Анісім, старшыня Таварыства беларускай мовы імя Скарыны**

**Рыгор Кастусёў, старшыня партыі БНФ**

**Станіслаў Шушкевіч, старшыня Вярхоўнага Савета 12-га скліканьня**

**Юрась Беленькі, намесьнік старшыні Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ**

**Вінцук Вячорка, падпісант Віленскага Мэмарандуму**

**Павал Севярынец, сустаршыня аргкамітэту Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі**

**Алена Талстая, сустаршыня Руху салідарнасьці “Разам”**

**Мікола Казлоў, выканаўца абавязкаў старшыні Аб’яднанай грамадзянскай партыі**

**Анатоль Лябедзька, дырэктар цэнтру “Эўрапейскі дыялёг”, дэпутат Вярхоўнага Савета 12-га і 13-га скліканьняў**

**Ад Рады Беларускай Народнай Рэспублікі – Івонка Сурвілла, старшыня Рады БНР**

Пазьней далучыліся да заявы:

**Юрась Губарэвіч, кіраўнік руху “За свабоду”**

**Вячаслаў Сіўчык, сябра Рады Беларускага нацыянальнага кангрэсу**

**Уладзімер Мацкевіч, прадстаўнік грамадзянскай ініцыятывы “Сьвежы вецер”**

**Уладзімер Някляеў, былы кандыдат у прэзыдэнты**

**Анастасія Дарафеева, старшыня партыі “Зялёныя”**

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

КАНЦЫЛЯРЫЯ СТАРШЫНІ

12 сьнежня 2019 г.

**Зварот Старшыні Рады БНР**

Дарагія беларусы, дарагія землякі ва ўсім сьвеце.

Незалежнасьць нашай бацькаўшчыны Беларусі сёньня знаходзіцца ў большай небясьпецы, чым калі-небудзь за апошнія дваццаць год. Непразрыстыя перамовы двух дыктатараў, А. Лукашэнкі і Ў. Пуціна, могуць распачаць працэс сапраўднага паглынаньня Беларусі з боку Расеі.

Цяперашні момант вымагае, каб наш народ, каб беларусы ва ўсім сьвеце ўголас заявілі пра тое, што мы ніколі ня прымем здачу незалежнасьці Беларусі. На працягу стагодзьдзяў тысячы беларусаў пралівалі сваю кроў і ахвяравалі сваімі жыцьцямі за тое, каб Беларусь стала незалежнай дзяржавай. Мы ня маем права аддаць ворагам тое, што нашыя продкі здабылі такой дарагой цаной.

Ад імя Рады БНР я заклікаю вас 20 сьнежня далучыцца да акцыяў пратэста супраць так званай “глыбокай інтэграцыі” Беларусі і Расеі.

Няважна, у якой краіне сьвету вы жывяце і ці шмат вакол вас іншых беларусаў. Выходзьце з дэманстрацыямі і пікетамі да дзяржаўных установаў, накіроўвайце свае лісты мясцовым урадам і грамадзкім арганізацыям, выказвйце сваю публічную пазыцыю ў любы зручны для вас спосаб.

8 сьнежня дамова між Пуцінам і Лукашэнкам не была падпісаная – магчыма, дзякуючы тысячам беларусаў, якія выйшлі на вуліцы Менску і іншых гарадоў Беларусі й сьвету ў абарону нашай незалежнасьці. Нажаль, дата падпісаньня была толькі перанесеная на 20 сьнежня. Небясьпека незалежнасьці – не паменшала.

Сёньня важна прадэманстраваць усяму сьвету, асабліва рэжымам у Менску і Маскве, нашую еднасьць і рашучасьць.

Будзьма разам!

**Івонка Сурвілла**
**Старшыня Рады БНР**

РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

КАНЦЫЛЯРЫЯ СТАРШЫНІ

20 сьнежня 2019 г.

**Зварот Старшыні Рады БНР**
**да ўдзельнікаў мітынгу ў Менску 20 сьнежня**

Дарагія суродзічы, дарагія землякі-беларусы!

Прайшло больш за сто гадоў з таго моманту, калі Беларусь заявіла ўсяму сьвету пра сваё жаданьне быць незалежнай дзяржавай. Усе гэтыя сто гадоў мы вядзем барацьбу супраць шавінізма, імпэрыялізма і тыраніі, якія прыходзяць да нас з усходу.

Тысячы людзей пралілі сваю кроў і ахвяравалі сваімі жыцьцямі за тое, каб Беларусь стала незалежнай дзяржавай. Мы ня маем права аддаць ворагам тое, што нашыя продкі заваявалі такой дарагой цаной. Мы ня маем права аддаць нашу незалежнасьць.

Беларусь будзе вольнай і незалежнай краінай, будзе займаць “свой пачэсны пасад між народамі”, у агульнай сям’і народаў дэмакратычнай Эўропы. Бо за намі праўда, за намі сіла, за намі справядлівасьць і дух нашых слаўных продкаў - “наш беларускі вольны дух”.

Будзьма разам, і мы пераможам! Жыве Беларусь!

**Івонка Сурвілла**
**Старшыня Рады Беларускае Народнае Рэспублікі**

(Зварот зачытаны Паўлам Севярынцам).

RADA BIEŁARUSKAJE NARODNAJE RESPUBLIKI

KANCYLARYJA STARŠYNI

31 śniežnia 2019 h.

**Navahodni zvarot**
**Staršyni Rady BNR Ivonki Surviłły**

Darahija surodzičy-biełarusy!

Ad imia Rady Biełaruskaj Narodnaj Respubliki vitaju vas z Novym hodam!

Žadaju ŭsim vam usiaho najlepšaha, ale pieradusim mužnaści, viery ŭ svaje siły j lubovi da ziamli vašych prodkaŭ. Bo ad vas zaležyc, ci Ajčyna naša zastaniecca niezaležnaj dziaržavaj i daść adpor imperyjalistyčnym ambicyjam našaha uschodniaha susieda, ci nie.

Narod, hodny hetaha imia, nia pojdzie dabravona nazad u niavolu imperyji, jakaja zrabiła stolki škody jamu na praciahu ŭsiaje jaho historyji. Kab jon nia viedaŭ pra hetyja złačynstvy, dasiul chavajucca ad jaho praŭda pra jaho minułaje, u školach vučac čužuju historyju, pramyvajuć ad dziacinstva mazhi, kab pierakanać, što zachopnik dobrazyčlivy, što jon toj “starejšy brat”, biez jakoha naš kraj nia moža abyjścisia!

U sapraŭdnaści ž, šantažujecca naš narod chłuślivymi abiacankami vyklučna kab adabrać ad jaho tuju žyćciazdolnaść, jakaja dazvoliła jamu vyžyć dziesiać stahodździaŭ na hetaj ziamli.

Nia viercie, maje darahija surodzičy, aficyjnaj prapahandzie. Nie davajcie nikomu pradać vaš kraj za krychu nafty!

Dabrabyt našaha narodu nikoli nia išoŭ z Uschodu. Naadvarot, susiedniaja imperyja viešna vykarystoŭvała vašyja mazhi, vašuju pracavitaść i vašyja maładyja pakaleńni, kab baranić svaje ŭłasnyja intaresy i abšary.

Źviartajusia da kožnaha biełarusa na hetaj ziamli: baraniecie hetuju dadzienuju vam Boham ziamielku, za jakuju prodki vašyja addavali nia raz na praciahu stahodździaŭ svajo žyćcio.

Adzinaje, što “pahłyblenaja intehracyja” zrobić, heta pahłybic vašuju zaležnaśc ad čužoje krainy, ad jakoj naš narod zdoleŭ vyzvalicca 25-ha Sakavika 1918 hodu!

Biełaruski narod razumny, pracavity i žyćciazdolny, i jon daść sabie rady, kali nia budzie čužych haspadaroŭ u jaho chacie!

Vychodźcie tysiačami baranić niezaležnaść vašaj ziamli!

Bo, jak kazaŭ u 1864 hodze Kastuś Kalinoŭski, “tolki tady, narodzie, zažyvieš ščaśliva, kali nad Taboju Maskala ŭžo nia budzie”.

Žyvie Biełarus!

**Ivonka Surviłła**
**Staršynia Rady BNR**

# Артыкулы і выступы

## Янка Запруднік, радны БНР
## Сьв. Пам. Антон Шукелайць: разьвітальнае слова.
## Студзень 2017 г.

Сьветлай памяці Антон Шукелайць часта прамаўляў на могільніках ці на паміках, разьвітваючыся з суродзічамі-працаўнікамі на беларускай ніве. Цяпер прыйшла чарга нам сказаць яму “Вечная памяць”.

Выконваю пры гэтым просьбу спадарыні Івонкі Сурвіллы, Старшыні Рады БНР – перадаю ейнае спачуваньне беларускаму грамадзву. Вось ейныя словы:

*“Страцілі мы сапраўды ўнікальнага чалавека, удзельніка беларускага руху ў самыя складаныя часы нашай найноўшай гісторыі. Радны БНР Антон Шукелайць быў адным з тых людзей, якія былі верныя Беларусі й змагаліся за яе незалежнасьць і яе дабрабыт на працягу ўсяго свайго доўгага жыцьця. Прыклад Антона Шукелайця будзе працягваць натхняць усіх нас. Вечная яму памяць.”*

Да гэтых праўдзівых словаў пра нябожчыка трэба дадаць, што па сваёй натуры ён быў чалавекам лагодным, глыбока рэлігійным, выдатным знаўцам беларускай этнаграфіі, плённым працаўніком на грамадзка-культурнай і палітычнай ніве. Ягоны ўдзел у арганізацыйным жыцьці й рэпрэзэнтацыйнай дзейнасьці быў разнастайным і плённым: у Радзе БНР, на доўгагадовым становішчы старшыні галоўнай управы БАЗА, у рэдакцыі газэты “Беларус”, у працы Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацва, а таксама ў безьлічы асбістых сустрэчаў з суродзічамі, якія прыяжджалі ў Нью Ёрк з розных краін сьвету, у тым ліку зь Беларусі; шмат каму зь іх ён быў гасьцінным гідам па горадзе.

Адыход Антона Шукелайця з жыцьця ў “вечную памяць” дае нам нагоду – і абавязак — задумацца над паняцьцем “вечная памяць”, над тым, як кволая чалавечая памяць набывае якасьць “вечнай”. Мы, людзі старэйшага веку, добра ведаем, якой плыткай і ненадзейнай бвае асабістая памяць. Дык у чым сутнасьць памяці “вечнай”?

У пошуку адказу на гэтае кардынальнае пытаньне, прыгадайма старажытных мудрых рымлянаў, якія пакінулі нам сэнтэнцыю: “Пра нябожчыкаў або добрае, або нічога”.

Дык чаму толькі добрае? А таму, што “добрая” памяць – фактар пазытыўна творчы. “Добрая” памяць пра папярэднікаў зьвязвае пакаленьні ў адзін

жывы арганізм, які мы называем народам. Мы прыпамінаем добрае ў нябожчыках, каб арыентавацца самым на добрае ў нашых учынках. Памяць пра добрае ў дзеяньнях папярэднікаў мацуе пераемнасьць пакаленняў, накіроўвае на вартасныя грамадзкія ўчынкі; памяць пра высакародных суродзічаў накіроўвае моладзь на правільны шлях, натхняе дзеячоў культуры, навукі й палітыкі служыць свайму народу; памяць пра нябожчыкаў-патрыётаў маральна забавязвае дзяржаўныя ўлады ўсіх узроўняў перахоўваць веду пра іх, самаахвярных сыноў і дочак нацыі.

Памяць, каб стаць вечнай, мусіць быць чалавечнай.

**Алесь Чайчыц, Сакратар інфармацыі Рады БНР**
**Выступ на 7. Зьезьдзе Беларусаў Сьвету ў Менску**
**15 ліпеня 2017 г.**

Шаноўныя сябры, я рады вітаць вас на гэтым прадстаўнічым Зьезьдзе.

Нас сабралося тут шмат людзей. Большасьць з нас нарадзіліся ў Беларусі і даўно зьехалі адсюль. Меншасьць – нарадзілася за мяжой, але памятае пра свае беларускія карані.

Беларуская дыяспара мае вялікі патэнцыял. Тыя, хто сёньня прысутнічае на Зьезьдзе, гэта маленькая верхавіна вялікага айсбэргу. За апошнія стодзьвесьце гадоў зь Беларусі выехалі дзясяткі ці нават сотні тысячаў чалавек. Многія зь іх дасягнулі вялікага посьпеху за мяжою. Многія з нашчадкаў гэтых людзей памятаюць пра сваё беларускае паходжаньне і гатовыя дапамагаць Беларусі.

Каб гэтыя людзі дапамаглі Беларусі, патрэбная дзяржаўная стратэгія што да працы з дыяспарай. Мы маем закон “Аб беларусах замежжа”, але ён носіць выключна рамачны характар. Закон толькі закладае агульныя асновы для палітыкі ў гэтай сфэры. Неабходна сфармуляваць дакладныя і канкрэтныя мэты і задачы, якіх мы разам – дзяржава і дыяспара – хочам дасягнуць, і азначыць інструмэнты дзеля гэтага.

Мы маем перад вачыма вельмі пасьпяховыя прыклады суседзяў Беларусі – Польшчы, Украіны, Латвіі, Літоўскай Рэспублікі. Яны вядуць вельмі актыўную і пасьпяховую працу з сваімі дыяспарамі. Гэты досьвед трэба вывучаць і пераймаць.

Вялікай праблемай ёсьць тое, што беларускія суполкі за мяжой працягваюць існаваць толькі дзякуючы прытоку новых мігрантаў зь Беларусі. Па сутнасьці, у другім пакаленьні беларусы ўжо асымілююцца і губляюцца для Беларусі. Праца як беларускіх дзяржаўных органаў, так і ЗБС “Бацькаўшчына” павінна быць скіраваная ў тым ліку і на другое, трэцяе і наступныя пакаленьні нашчадкаў выхадцаў зь Беларусі.

Нарэшце, хачу ў заканчэньне свайго выступу зьвярнуць увагу на вялікія юбілейныя даты, якія выпадаюць на 2017 і 2018 гады. Гэта 100-гадовы юбілей Першага ўсебеларускага Зьезду і абвяшчэньня Беларускае Народнае Рэспублікі.

Стагодзьдзе БНР — гэта вялікі юбілей і сьвята для ўсіх беларусаў, каму дарагія беларускія сувэрэнітэт і дзяржаўнасьць. Гэта не залежыць ад палітычных поглядаў, сьцяга і мовы. З абвяшчэньнем БНР на месцы былых губэрняў на палітычнай карце зьявілася Беларусь у сваім сучасным выглядзе: пад сваёй сучаснай назвай, са сваёй сучаснай сталіцай. Беларусь была ўпершыню абвешчаная дэмакратычнай рэспублікай. БНР, БССР і цяперашняя Рэспубліка Беларусь — гэта этапы аднаго і таго ж шляху, які пачаўся ў лютым і сакавіку 1918 года.

Я заклікаю беларусаў ва ўсім сьвеце годна адзначыць гэты важны юбілей.

Дзякую за ўвагу.

## Хведар Ньнюка, сябра Прэзыдыюма Рады БНР
## Выступ на 7. Зьезьдзе Беларусаў Сьвету.

Вельмі хутка праляцелі чатыры гады ад шостага зьезду. Шмат значных і важных падзей адбылося за гэты час у сьвеце – зьмяняліся палітычныя і эканамічныя асновы дзяржаў сьвету, дзе мірным шляхам, а дзе з кроўю.

Толькі ў нашай Беларусі ўсё захавалася стабільна, як было раней. Як каралі, так і караюць: звальненьнем з працы, штрафамі, міліцэйскімі расправамі за гістарычную нацыянальную сымболіку, за мірныя пратэстныя акцыі, за крытыку існуючага рэжыму,тым самым  парушаючы элемэнтарныя правы чалавека. Не палепшылася драматычная сытуацыя зь беларускай мовай , яна ня стала дзяржаўнай, у адрозьненьне ад сытуацыі ва ўсіх суседніх краінах.

У Літве на галоўных каналах тэлебачаньня кожны тыдзень перадаюцца канцэрты па заяўках слухачоў і гледачоў. Канцэрт доўжыцца 2-3 гадзіны і запоўнены выключна літоўскай эстраднай і народнай музыкай і ніякай другой. Дык вось, прыклад адносін дзяржавы да сваёй мовы. Ці магчыма такое ў Беларусі?

Справа мовы архіважная для захаваньня беларускага этнасу. Калі параўнаць колькасьць выдаваемых дзяржаваю беларускіх газэт, кнігаў і іншай прадукцыі, то варта спытаць: у якой незалежнай дзяржаве мы жывем?

А школы, якія павінны выхоўваць беларускіх патрыётаў, якія захаваюць беларускі этнас і культуру, а таксама пры патрэбе будуць  абараняць Беларусь ад сапраўдных ворагаў, а не ад выдуманых – зь “пятай калёны” ці “Белага легіёна”. Сумна, але ў гарадах Беларусі наогул беларускіх школ няма – поўная русіфікацыя. Беларуса трэба выхаваць, каб ён стаў сапраўдным патрыётам сваёй краіны. Так робяць усе цывілізаваныя народы сьвету.

З гонарам хачу адзначыць, што дзякуючы маім намаганьням і добрым адносінам з усімі літоўскімі ўладамі, мне ўдалося атрымаць дазвол на бюджэтным фінансаваньні адчыніць у Вільні беларускую школу (цяпер гімназія) і беларускі факультэт пры пэдунівэрсытэце. Аднак, замест падзякі, на працягу дваццаці гадоў адносіны паміж мною і беларускай амбасадай з падкантрольнай ёй беларускай школай разарваныя. Прычына – мае шматлікія пратэстныя акцыі супроць існуючага рэжыму і супроць парушэньня правоў чалавека ў Беларусі.

Хачу нагадаць мой асабісты прыклад з жыцьця і станаўленьня нас да нацыі і народа. Я жыў у Беларусі пры польскай уладзе, вучыўся і выхоўваўся ў польскай школе і ў польскім духу, бо ні беларускіх, ні іншых не было. У 1942 годзе адчыніліся беларускія школы, усе школы перайшлі на беларускую мову. Настаўнікі, бальшыня з іх, былі мясцовыя беларускія патрыёты і вучылі нас праўдзівай беларускай гісторыі. Я зразумеў, што ніякі я не паляк і мова мая павінна быць беларускаю. У школе я стаў актывістам і беларускім патрыётам, і захаваў гэта на ўсё жыцьцё, ды стаў сябрам Беларускай Народнай Самапомачы. У часе нямецкай акупацыі я памагаў беларусам і беларускай справе, прафесійна валодаючы нямецкай моваю.

Цяпер цёпла і з удзячнасьцю ўспамінаю сваіх першых настаўнікаў-выхаваўцаў. Нажаль, лёс іх склаўся трагічна. Як пашану да іх памяці, хачу назваць некаторых зь іх: гэта прафэсар, выкладчык гісторыі Дзьмітры Агіцкі; фізыку і матэматыку выкладалі Язэп і Юрка Клышэвічы, культуру – Пётра Рандарэвіч, Шляхтун і іншыя.

Пётра Рандарэвіч, Язэп і Юрка Клышэвічы і шмат, шмат іншых былі замардаваныя чырвонымі ці белымі бандамі, якія не змагаліся з акупантамі, а забівалі беларускіх актывістаў-адраджэнцаў.

Прафэсар Дзмітры Агіцкі, сын сьвятара ў Шчучынскай царкве, перажыў вайну, але асабістае жыцьцё склалася ня менш трагічна. Мне даслалі газэту “Кароль Лір са Шчучынскага раёну”, дзе апісаныя апошнія гады жыцьця гэтага выдатнага навукоўца і патрыёта . Гэта ён першы спрычыніўся да выхаваньня мяне беларускім патрыётам, што і пранёс я праз усё жыцьцё. Таму і тэрміновы пераезд мой напрыканцы 1943 года ў Вільню не быў прыпадковым, а зьвязаны быў з маёй беларускасьцю.

Жыцьцё паказвае, што як толькі пры акупацыях зьяўляюцца спрыяльныя ўмовы (першая і другая сусьветныя войны), беларусы здольныя арганізавацца і змагацца за свае інтарэсы, і, у першую чаргу, закладаюць беларускія нацыянальныя школы. Аб чым сьведчаць дакумэнты. У мяне захаваўся арыгінал пашпарта, выдадзенага ў Літве ў 1916 годзе на нямецкай і беларускай мове – не на рускай, ці польскай, ці літоўскай, а на беларускай.

(публікуецца з скаротамі)

## Вячаслаў Бортнік, сябра Прэзыдыюма Рады БНР
## “Яскравы беларускі нацыянальны характар”: да 90-годдзя Марыі Дзямковіч.

Праца на пасадзе Сакратара Рады БНР дала мне магчымасьць пазнаёміцца з многімі беларусамі замежжа: з кімсьці падчас асабістых сустрэчаў, зь іншымі ў працэсе ліставаньня ці размоваў па тэлефоне. Цікавая перапіска завязалася з доктаркай Марыяй Дзямковіч. Патрошку ў лістах яна распавяла мне гісторыю свайго жыцьця й дзейнасьці на карысьць роднай Беларусі.

Новае пакаленьне амэрыканскіх беларусаў амаль што нічога ня ведае пра тое, што рабілася 20-30, ня кажучы 70, гадоў таму. Нажаль, пераемнасьць пакаленьняў сёньня рэдкая зьява. Таму асабістыя гісторыі людзей як Марыя Дзямковіч маюць надзвычайную важнасьць для ўсіх нас. і прыпамінаць іх трэба ня толькі падчас юбілеяў. Дарэчы, 15 лютага спадарыня Дзямковіч сьвяткуе 90-годдзе.

Марыя пакінула родную вёску Моталь на Палесьсі маленькай дзяўчынкай, але любоў да Беларусі пранесла праз усё жыцьцё…

Дзядуля Марыі Пётра быў расстраляны партызанамі ў 1943 годзе. І ня толькі ён, але амаль уся сям’я. Гэта былі моцныя беларусы, якія цьвёрда стаялі на сваёй зямлі, умелі добра яе апрацоўваць, займаліся пчалярствам, мелі млын. Былі вясёлыя, прывязаныя да зямлі гаспадары…

Яе любімая 13-гадовая сяброўка Наста й брат Коля (якому споўнілася ўсяго 10 гадоў!) былі расстраляныя разам з бацькамі. “Віна” іхная складалася з таго, што дзядуля трохі ведаў нямецкую мову, і аднойчы немцы прымусілі яго нешта перакладаць. Марыі тады было 13 гадоў. Затым – выгнаньне з свайго дома, дзе жылі продкі, спроба ўладаў выкрэсьліць з народнай памяці тых, хто нешта ўмеў, нешта ведаў і меў мужнасьць супрацьстаяць гвалту.

Перада мною ліст з малай радзімы, дасланы спадарыні Марыі ў 1989-м годзе:

*“Больш пяцідзесяці год мінула з тае пары, калі лёс разлучыў нас, маленькіх сябровак зь вёскі Моталь. Так здарылася, што Марыя Дзямковіч апынулся ў далёкай Амэрыцы, дзе жыве з сям’ёй і ў цяперашні час, але не забыла за столькі год жанчына сваіх аднавяскоўцаў.*

*Ведаючы, што на радзіме настаў не вельмі лёгкі час, яна прыехала да нас з дапамогай. Прывезла ў родную вёску Моталь шмат мэдыкамэнтаў,*

*акуляраў, многа чаго іншага. Усё гэта яна падаравала Мотальскай участковай бальніцы, а таксама людзям, якія прыходзілі да яе па дапамогу. Ніводнага чалавека не пакінула жанчына без увагі, для кожнага знайшлося ў яе й цёплае слова падтрымкі, й карысная парада. Асабліва ўразілі нас яе цярплівасьць, ветлівасьць, працавітасьць".*

На пачатак 1992 года д-р Дзямковіч перaслала ў Беларусь мэдыкамэнтаў больш чым на 100 тысячаў даляраў.

А вось яшчэ адзін ліст падзякі зь вёскі Закальле, надрукаваны ў газэце "Чырвоная Зьвязда" 23 верасьня 1997 года:

*"Спн. Дзямковіч увесь час аказвае матар'яльную дапамогу сваім землякам ня толькі з роднай вёскі, але й суседніх. ...акрамя таго, што Марыя прывозіла асабіста, на адрас яе землякоў паступіла 13 пасылак зь лекамі, медыцынскімі прыладамі, абсталяваньнем. Прыйшла такая пасылка і ў маю вёску. Яе перадалі ў маю сям'ю, бо ў нас сямёра дзяцей, ёсьць немалыя матар'яльныя праблемы. Дзякуй за гэта!"*

У красавіку 1993 года менская газэта "Набат" зьмясьціла артыкул пра наведваньне Беларусі амэрыканскай дэлегацыяй мэдыкаў на чале з прафесарам Пітсбургскага ўніверсытэту Томасам Фолі. Прафэсара Фолі зацікавіла чарнобыльскай праблемай менавіта Марыя Дзямковіч. Прафесар Фолі ўжо трэці раз быў у Беларусі. Дзякуючы ягоным захадам і пры актыўнай дапамозе доктара Дзямковіч, а таксама беларускае грамады ЗША, яму ўдалося атрымаць грант на 240 тысячаў даляраў дзеля супрацоўніцтва паміж амэрыканскімі й беларускімі лекарамі, што спэцыялізуюцца ў мэдычнай радыялёгіі.

Марыя Дзямковіч заваявала славу ў США як цудоўны доктар і грамадзкая дзячка. Пра гэта гавораць найперш такія факты, што яна заўважана кіраўніцтвам ЗША. Была на сустрэчах з прэзыдэнтамі Бушам (старэйшым) і Клінтанам, а таксама сябруе з адной з самых слынных ва ўсім сьвеце нашых зямлячак, шматразовай алімпійскай чэмпіёнкай Вольгай Корбут.

Аднойчы, выступаючы на Кангрэсе Рэспубліканскай партыі ў Вашынгтоне, д-р Дзямковіч заявіла:

*"...пытаньне, якое тычыцца маладых незалежных дзяржаваў новай Садружнасьці. Мы ня бачым занадта шмат энтузіязму з боку прэзыдэнта (Буша – В. Б.) ў аказаньні дапамогі новым незалежным рэспублікам былога СССР.*

*Прэзыдэнт Буш паказаў вялікую сілу падчас “халоднай вайны”, падчас зьменаў у былым Савецкім Саюзе. Ён не прызнаў “путч”. Амэрыканскія беларусы хацелі б бачыць больш увагі й матар’яльнай падтрымкі новай дэмакратыі, правядзеньні эканамічных рэформаў. Калі гэтага не зрабіць, то ізноў прыйдзе дыктатура й “халодная вайна”. А мы гэтага ня можам сабе дазволіць”.*

Якія прарочыя словы!

У архіве спн. Дзямковіч шматлікія лісты падзякі ад амбасадараў й міністра замежных справаў Беларусі, Генэральнага сакратара ААН Бутраса Бутраса-Галі. Яна атрымала ўзнагароду Міністэрства аховы здароўя Польшчы і ейнае імя ўключана ў шматлікія біяграфічныя даведнікі ЗША. Спн. Дзямковіч многія гады падтрымлівала газэту “Беларус”, а таксама шматлікія дабрачынныя арганізацыі ў ЗША.

Марыі Барысаўне прысьвячалі вершы паэты. Некалькі вершаў напісаў Язэп Васілеўскі, праўда па-расейску. А яшчэ гісторыя ейнае сям’і лягла ў аснову манумэнтальнае трылёгіі Васіля Якавенкі пра лёс Беларусі ў 20-м стагоддзі “Пакутны век”. Вось, што піша пра яе ў гэтым кантэксьце філёляг Аляксей Рагуля:

*“Тут мне ўяўляецца ўся сям’я Рамановічаў (дзявочае прозьвішча Марыі – В. Б.). Лёс іх моцна пакалечыў, пакруціў, яны праз вялікія “жорны” прайшлі, а ўцалела, па сутнасьці – хто? – можна сказаць, адна Марыя Раманавічанка. І мы бачым, засталася яна зусім неардынарнай асобай, вялікай жанчынай, чалавекам вялікага сэрца, з думкай пра сваіх блізкіх, пра родных, пра Бацькаўшчыну, пра яе будучыню. Нават ня думкай – у яе ж падсьвядомае адчуваньне свайго абавязку й сваёй нутранай патрэбы быць заўсёды зь людзьмі. Гэта яскравы беларускі нацыянальны характар”.*

Лепей я не скажу. З днём народзінаў й моцнага здароўя на доўгія гады, спн. Марыя!

# Summary in English


### The Rada of the Belarusian Democratic Republic: Integrated annual report for 2017, 2018 and 2019

The Rada of the Belarusian Democratic Republic (the BNR Rada) is the oldest existing Belarusian governmental body, established in 1917 at the All-Belarusian Congress of political organisations and local governments in Minsk. In 1918 the BNR Rada acted as the temporary supreme legislative and executive body of the Belarusian Democratic Republic. Since 1919 the BNR Rada is in exile and represents the interests of an independent and democratic Belarus. During these years, the BNR Rada has established and maintains working contacts with representatives of governments of democratic countries, advising them on policies towards Belarus. Besides that, the BNR Rada acts as a worldwide forum for representatives of politically active communities of the Belarusian diaspora.

In 2018 Belarusians all over the world celebrated the 100th anniversary of the Belarusian Democratic Republic and the modern Belarusian statehood. Numerous events were held by Belarusian communities and organizations in various countries. President of the BNR Rada took part in official ceremonies in the Parliament of Canada, the British Parliament and the City Hall of Prague. On the occasion of the centeniary, the BNR Rada has issued the Belarusian Democratic Republic 100th Jubilee Medal which was awarded to more than 180 persons across the world for their work in restoring the independence of Belarus, promoting human rights and democracy in Belarus as well as reviving and promoting the Belarusian culture. The recipients of the medal included Belarusian and foreign politicians, activists, researchers and artists.

The BNR Rada held its 30th Session in November 2019 in Vilnia (Vilnius, Lithuania). The Session was preceded by a meeting with leaders of the Belarusian democratic opposition and a joint resolution by the BNR Rada and the key Belarusian political parties and movements regarding threats to the independence of Belarus presented by the potential integration of Belarus under the present authoritarian regime with today’s authoritarian and nationalistic Russia.

# Кантакт

pressgroup@radabnr.org

www.radabnr.org

www.facebook.com/radabnr

www.twitter.com/radabnr

www.instagram.com/bnr_rada

© Рада Беларускае Народнае Рэспублікі, 2020 г.

Адказны рэдактар: Алесь Чайчыц